Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЛІСТАПАДА 2016 г. ПЯТНІЦА № 218 (28328)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Са стыхіяй на «ты»

СТАР. 3



Сем рэпетыцый... рабавання

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

# Маладыя гады, маладыя жаданні...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сужэнцы Пётр і Таццяна СОЛАДАВЫ з Мінска выйшлі на прагулку з шасцімесячнай дачушкай. Пакуль Ганначка соладка спала на свежым паветры, маладыя людзі скарысталіся магчымасцю пагуляць у снежкі, як у дзяцінстве.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена ПЯРМІНАВА, дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:**

*«Мы ні ў якім разе не закрываем абмеркаванне праекта ўказа «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь». Несумненна, што дыялог будзе весціся. Неабходнасць змяненняў ва ўказ №372 наспела даўно, і пра гэта гавораць не толькі прадстаўнікі дзяржорганаў, але і ўладальнікі аграсядзіб. Асноўнае ў прэтэнзіях у тым, што па сутнасці некаторыя сядзібы працуюць па прынцыпе банкетных залаў і зацікаўлены ў першую чаргу ў правядзенні масавых мерапрыемстваў, а не ў развіцці турызму ў вёсцы».*

■ Насуперак стэрэатыпам

## У грамадстве або ў чатырох сценах?

### Ці стануць вучні з асаблівымі патрэбамі часткай вялікай школьнай сям'і

**Ці гатова беларускае грамадства да масавага ўкаранення інклюзіі ў сістэму агульнай адукацыі? Як змагацца з распаўсюджанымі стэрэатыпамі і забабонамі? З якімі праблемамі сутыкаюцца педагогі навучальных устаноў, уключаных у рэспубліканскі праект па інклюзіўнай адукацыі? Ці трэба цалкам адмаўляцца ад сістэмы спецыяльнай адукацыі? Адказы на ўсе гэтыя пытанні шукалі ўдзельнікі першай Міжнароднай канферэнцыі «Інклюзіўныя працэсы ў адукацыі», якая прайшла ў Мінску і сабрала больш як 300 спецыялістаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый з Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны, Казахстана, Турцыі, Італіі і іншых краін.**

СТАР. 4




■ Па-чалавечы

## БЕЛЫ БІМ — НІЧЫЙНАЕ ВУХА

**Дождж ліў не спыняючыся. Пранізлівы вецер, здавалася, прабіраў да самых касцей, калі я выйшла з цягніка ў Стоўбцах. У такое надвор'е, як кажуць, добры гаспадар сабаку на вуліцу не выганіць. І вось нібы тая варона накаркала. У зале чакання чыгуначнай станцыі літаральна пад нагамі пасажыраў блытаецца шчанюк, худы, знясілены, ледзьве трымаецца на лапах. На шыі чырвоны раменьчык ад блох. Відаць, жыў дома або на дачы...**

Пасля заканчэння дачнага сезона пачынаецца вялікая міграцыя па ўсёй краіне. Людзі напрацаваліся, надыхаліся свежым паветрам, даелі апошнія шашлыкі і вяртаюцца ў горад лячыць радыкуліт, што зарабілі на градках. Пасля загрузкі ў легкавік сваіх дамачадцаў, у багажнік — мяхоў з бульбай, слоікаў з хатнімі нарыхтоўкамі, аказваецца, што месца для сабакі або ката ўжо не хапае. І кожны шукае для сябе апраўданне. У цешчы абвастрылася астма ад поўсці, ды і наогул гэты хвастаты не дае па начах нармальна спаць: вострыць кіпцюры аб новую мэблю.

Магчыма хтосьці з былых гаспадароў і пусціць слязу, якая высахне па меры набліжэння да горада. А затым усё забудзецца, як дрэнны сон, і жыццё ўвойдзе ў звыклую каляіну. Якім жа чэрствым, мякка кажучы, трэба быць, каб прыручыць жывёліну, а затым кінуць яе на немінучую гібель. І не варта суцяшаць сябе, што беспрытульнікі выжывуць і пракормяцца без дапамогі чалавека. Некаторы час былыя любімцы яшчэ будуць з надзеяй чакаць, што гаспадары вернуцца, забяруць з сабой. Але многія з іх тут застануцца тут назаўсёды. Тых, хто не загіне ад голаду, даканае холад. Кінутыя сабакі пачнуць збівацца ў небяспечныя для мясцовых жыхароў зграі. Па іх прыедуць людзі са стрэльбамі...

СТАР. 3

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.11.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9109 ▲ |
| Еўра | 2,0885 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0301 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0747 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА, 5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Ідэі ад канкрэтных людзей

**Прэзідэнт патрабуе ад сваёй Адміністрацыі прынцыпова змяніць стыль працы і наладзіць больш эфектыўную работу з кадрамі**

**Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў, прымаючы з дакладам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Косінца.**

«У вас занадта вялікая запазычанасць перад Прэзідэнтам па прапрацоўцы кадравых пытанняў. Па гаспадарчых суб'ектах, вызначальных прадпрыемствах фактычна няма кіраўнікоў не адзін дзень і не адзін тыдзень», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама даручыў з першага студзеня наступнага года прынцыпова змяніць стыль і сістэму работы Адміністрацыі Прэзідэнта. «Я ўвяду ў практыку (а вы возьміце на кантроль) заслухоўванне раз у квартал кіраўніцтва Адміністрацыі, якое прыйдзе да мяне і раскажа людзям нейкія новыя ідэі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Прыму я іх ці не, гэта ўжо мая справа і маё права, але ідэі гэтыя павінны быць — зямныя, прыземленыя, непрычасаныя. Гэтыя ідэі павінны быць ад канкрэтных людзей, і прычэсваць іх на ўзроўні кіраўніка Адміністрацыі і намеснікаў ні ў якім разе нельга. У адваротным выпадку ўсякая творчасць і свабода дзеянняў знікае ў дзяржаўнага служачага».

На сустрэчы разглядалася планаванне дзейнасці кіраўніка дзяржавы, у тым ліку ў сферах кадравай палітыкі, пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця, нацыянальнай бяспекі, міжнароднай дзейнасці. Абмеркаваны праект адпаведнага плана на 2017 год. Ён досыць насычаны і ўключае ў сябе як ужо названыя напрамкі, так і ідэі, маштабныя мерапрыемствы, якія неабходна будзе разгледзець на ўзроўні Прэзідэнта ў часткі інвестыцыйнай палітыкі, развіцця аграпрамысловага комплексу, радыёэлектронікі, будаўнічага комплексу. Падымаліся і пытанні развіцця спорту, адукацыі, навукі, жыллёва-камунальнай сферы.

На сустрэчы была разгледжана рэалізацыя даручэнняў, якія раней даваў кіраўнік дзяржавы па развіцці індустрыяльнага парка «Вялікі камень», мікраёна Лябяжы ў Мінску, будаўніцтве комплексу «Мінск-Мір», падрыхтоўцы да II Еўрапейскіх гульняў. Сярод пытанняў, якія абмяркоўваліся, былі і выкананне прагнозных паказчыкаў, рэгіянальная палітыка, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Тэмамі даклада таксама сталі аптымізацыя дзяржаўнага апарату кіравання і кадравыя пытанні.

## ПЕРАНОС РАБОЧЫХ ДЗЁН НА НАСТУПНЫ ГОД

**Савет Міністраў пастановаў №912 ад 9 лістапада зацвердзіў графік пераносу рабочых дзён у 2017 годзе. Адпаведная інфармацыя размешчана на афіцыйным сайце ўрада.**

Згодна з дакументам, рабочыя дні ў 2017 годзе пераносяцца з панядзелка 2 студзеня на суботу 21 студзеня; з панядзелка 24 красавіка на суботу 29 красавіка, з панядзелка 8 мая на суботу 6 мая; з панядзелка 6 лістапада на суботу 4 лістапада. Арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) ажыццяўляць перанос рабочых дзён у іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам. Пастанова прынята згодна з часткай 6 артыкула 136 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Падпіска-2017

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

## СТАЛІЦА ВЫБІРАЕ «ЗВЯЗДУ»



**Падзяка ад рэдакцыі — начальніку аддзела сацыяльнага развіцця мінскага Камароўскага рынку Івану ТКАЧЧУ.**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Колькасць падпісчыкаў нашай газеты ў Мінску з цягам часу павялічваецца. Арганізацыя падпіскі — справа надзвычай адказная. Менавіта такі падыход практыкуюць, напрыклад, у Савецкім раёне сталіцы. Адсюль і станоўчыя вынікі распаўсюджвання тут друкаванага слова. Як заўважыла намеснік кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна Аксана Волкава, найбольшы эфект мае менавіта сумесная работа.

Выпісваюць нас шмат арганізацый раёна, а лепшымі з лепшых па выніках падпіскі на другое паўгоддзе 2016-га былі прызнаны мінскі Камароўскі рынак, а таксама 34-я цэнтральная раённая клінічная паліклініка. Яны ва ўрачыстай абстаноўцы атрымалі ад «Звязды» памятныя падарункі. Пераканаы, што ў Савецкім раёне «Звязда» і надалей застанецца адным з найбольш запатрабаваных перыядычных выданняў. Тым больш што наступны год шмат у чым адметны. Застаемся разам!

■ На слыху

# ДЛЯ ЎЛАСНЫХ ПАТРЭБ — БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

**А ПЕРАВОЗІЦЬ ДАЗВАЛЯЕЦЦА ТОЛЬКІ ДА 5 ЛІТРАЎ НЕМАРКІРАВАНАГА АЛКАГОЛЮ**

**Аб гэтым гаворыцца ў Дэкрэце №5 «Аб перамяшчэнні, захоўванні і продажы фізічнымі асобамі алкагольных напояў», які быў падпісаны кіраўніком дзяржавы 8 лістапада.**

У паведамленні прэс-службы беларускага лідара ўдакладняецца, што «дакумент выдадзены ў мэтах комплекснага ўдасканалення механізмаў процідзеяння незаконнаму абароту алкаголю і прадугледжвае адмену абмежавання па колькасці алкагольных напояў, маркіраваных акцызнымі маркамі Беларусі і спецыяльнымі маркамі, якую фізічныя асобы, што не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, могуць захоўваць і перамяшчаць (не для камерцыйных мэт)».

Таксама дэкрэтам адмяняецца абмежаванне па колькасці алкагольных напояў, якія былі выраблены за межамі краіны і не маюць адпаведных акцызаў, калі гэтыя напоі захоўваюцца для асабістых мэт. Аднак дэкрэт вызначыў гранічны аб'ём (5 л) такіх алкагольных напояў, які людзі маюць права перамяшчаць па тэрыторыі краіны. За парушэнне гэтага абмежавання дэкрэтам устаноўлена адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры ад 10 да 100 базавых велічынь (БВ) з канфіскацыяй алкагольных напояў, якія перавышаюць дазволеную да перамяшчэння колькасць, або без канфіскацыі. За паўторнае падобнае парушэнне на працягу года дадаткова прадугледжваецца магчымасць канфіскацыі транспартных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для перамяшчэння такога алкаголю, незалежна ад таго, у чыёй уласнасці яны знаходзяцца.

Дэкрэтам узмацняецца адказнасць за прыватны продаж алкаголю без акцызаў, у тым ліку ўласнай вытворчасці, пры адсутнасці прыкмет незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. Зараз такі алкаголь будзе канфіскаваны ў любым выпадку, а за паўторную арганізацыю падобнага бізнесу на працягу года прадугледжваецца павелічэнне максімальнага памеру штрафу з 20 да 30 БВ.

КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

### Абараніць айчынны рынак ад няякаснага замежнага фальсіфікату

Выкананне нормаў гэтага дакумента павінна істотна палепшыць сітуацыю на алкагольным рынку краіны, паведаміла карэспандэнту «Звязды» **начальнік упраўлення кантролю падакцызных тавараў Міністэрства па падатках і зборах Галіна ЯНУШКЕВІЧ.**

Па-першае, гэты дакумент накіраваны на зняцце любых бар'ераў па захоўванні і перамяшчэнні алкаголю не для камерцыйных мэт, пры ўмове, што гэтыя напоі знаходзяцца ў законным абароце. Калі алкаголь быў прададзены для ўласнага спажывання, то прэтэнзій з боку дзяржавы да іх не будзе, кажа Галіна Янушкевіч. Забараняць, напрыклад, калекцыянаванне розных відаў алкагольных напояў ніхто не збіраецца.

Разам з тым дэкрэтам прадугледжваецца больш жорсткая адказнасць для тых фізічных асоб, якія на алкаголі незаконна зарабляюць грошы.

Па-другое, захаванне колькаснага абмежавання па перамяшчэнні немаркіраванага алкаголю ў аб'ёме да 5 літраў на тэрыторыі Беларусі накіравана на абарону ўнутранага рынку ад паступлення няякасных, фальсіфікаваных алкагольных напояў з-за мяжы, на скарачэнне ценявога абароту гэтай прадукцыі. Прычым, ценявы абарот такіх напояў існуе ў нас у першую чаргу за кошт алкаголю, які трапляе ў краіну з боку Расіі, лічыць спецыяліст. Больш за тое, дзяржаўнымі службамі нашай краіны было выяўлена, што ў ценявым абароце Беларусі прысутнічае расійскі алкаголь, які быў выраблены на тэрыторыі суседняй дзяржавы незаконна і без адпаведнага кантролю якасці. Зразумела, што шкода для здароўя ад ужывання такога алкаголю можа быць каласальнай.

### Вагу «памылкі» ацэніць суд

Захоўваецца памер штрафу за незаконнае перамяшчэнне немаркіраваных алкагольных напояў у памеры ад 10 да 100 базавых велічынь. Але тут уводзіцца і альтэрнатыўная канфіскацыя такога алкаголю. У залежнасці ад многіх фактараў цяжкасці правапарушэння, менавіта суд будзе вырашаць дылему — выкарыстоўваць норму з канфіскацыяй або не.

Пры паўторнасці падобных парушэнняў знікае і мяккасць магчымых санкцый. Цяпер прадугледжваецца штраф ад 20 да 100 БВ з абавязковай канфіскацыяй алкагольных напояў звыш акрэсленай колькасці. Больш за тое, для шматразовых парушальнікаў уводзіцца і магчымасць канфіскацыі транспартных сродкаў, на якіх гэты алкаголь перамяшчаўся.

### Аб продажы з рук

Паводле слоў Галіны Янушкевіч, продаж алкагольных напояў фізічнымі асобамі забараняецца, калі апошнія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Штраф за такі незаконны гандаль складае ад 5 да 20 БВ. Прадугледжваецца канфіскацыя алкаголю, які быў выстаўлены на незаконны продаж. Прычым канфіскуюць не толькі напоі, якія былі «засвечаны» на месцы правапарушэння, але і ўсе алкагольныя запасы «гарэлачнага» камерсанта. Паўторнасць гэтага парушэння павялічвае штраф амаль удвая (10—30 БВ).

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ ФЁДАРА КАРПАВІЧА

**З чым ідуць на прыём да старшыні Мінаблвыканкама**

**У Фёдара Голуба з Капыльскага раёна цікавы і нялёгкі лёс. Фёдар Карпавіч — непаўналетні вязень канцэнтрацыйнага лагера, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, інвалід II групы. Пасля вайны аднаўляў народную гаспадарку, працаваў на розных пасадах. Усюды цанілі яго прафесіяналізм, адказнасць у выкананні сваіх абавязкаў. Ён заслужаны работнік прамысловасці БССР, атрымлівае асобую пенсію. Агульны працоўны стаж — 47 гадоў. Пражывае з жонкай Яўгеніяй Андрэеўнай у вёсцы Доўгае Капыльскага раёна. Да гэтага гаспадар працаваў на Любаншчыне.**

**У падсобным памяшканні ўстаноўлены вялікі кацёл на цвёрдым паліве. Ды абслугоўваць яго з улікам узросту і здароўя пенсіянеры не ў стане. Фёдар Карпавіч звярнуўся ў райвыканкам з просьбай аказаць яму дапамогу ва ўладкаванні на прысядзібным зямельным участку газавага рэзервуара. Але гэта дарагое задавальненне, толькі работы па ўстаноўцы цягнуць на 15 тыс.**

— У Любань мяне накіравалі ў 1977 годзе для ўводу ў дзеянне камбіната будаўнічых матэрыялаў. Тут мне выдзелілі дом, які затым дзяржава перадала бязвыплатна ва ўласнасць як ветэрану Вялікай Айчыннай вайны. У 1994-м я пайшоў на пенсію, а жыллё здаў у арэнду, афарміўшы адпаведны дагавор. Сам пераехаў на дачу ў Капыльскі раён, якую пабудаваў сваімі рукамі. Але ж, каб ведаў, што чакае, падаслаў бы саломкі, каб не балюча было падаць. Наймальнік падрабіў дакументы на продаж дома з маім подпісам. Махляр ужо памёр, дом пустуе, а я вымушаны жыць з жонкай на дачы. Мая спадарожніца жыцця з-за ўсёй гэтай гісторыі перанесла інсульт.

З такой крыўдай прыйшоў пенсіянер на прыём да старшыні Мінаблвыканкама Сямёна Шапіры. Фёдар Карпавіч не пакідае надзеі даказаць, што ён стаў ахвярай аферыстаў.

Папярэдне ва ўсіх абставінах разбіраліся спецыялісты. Па іх словах, сітуацыя, сапраўды, неадназначная. Чалавек, якога Фёдар Карпавіч пусціў у свой дом на правах арэнды, прадаў яго нерухомасць. А затым новы ўласнік перапрадаў яго іншай асобе. Суды ўсіх інстанцый адхілілі іскавыя патрабаванні Фёдара Голуба і пакінулі здзелку куплі-продажу нерухомасці ў сіле. Тэрмін іскавай даўнасці мінуў, і сёння вярнуць жыллё былому гаспадару не прадстаўляецца магчымым.

Варта сказаць, што ў ветэрана ёсць дом плошчай 100 квадратных метраў у вёсцы Доўгае Капыльскага раёна. Але праблема ў тым, што ў ім холадна. Кацёл ацяпляе толькі кухню. У астатніх пакоях гаспадарам у халодную пару года знаходзіцца немагчыма. У падсобным памяшканні ўстаноўлены вялікі кацёл на цвёрдым паліве. Ды абслугоўваць яго з улікам узросту і здароўя пенсіянеры не ў стане. Фёдар Карпавіч звярнуўся ў райвыканкам з просьбай аказаць яму дапамогу ва ўладкаванні на прысядзібным зямельным участку газавага рэзервуара. Але гэта дарагое задавальненне, толькі работы па ўстаноўцы цягнуць на 15 тыс. еўра. А бюджэтам не прадугледжана будаўніцтва індывідуальных крыніц ацяплення для грамадзян. У Фёдара Карпавіча ёсць магчымасць падключыць электрычны тэн для абагрэву дома, але гэта таксама вельмі дорага.

Пенсіянер нават гатовы аддаць свой дом раёну ўзамен на сацыяльнае жыллё. Ды па законе такі падарунак райвыканкам не мае права прыняць.

Яму растлумачылі, што ў чарзе на атрыманне сацыяльнага жылля стаіць 161 чалавек. Гэта інваліды, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, многія з іх наогул не маюць ніякага кутка. І парушаць чаргу ніхто не будзе: няма такіх паўнамоцтваў.

Як варыянт, бацькі маглі б на зіму перасяліцца да дзяцей або ў дом кругласутачнага знаходжання. Але яны адмаўляюцца.

— Трэба пастарацца дапамагчы заслужаным людзям, — звярнуўся да старшыні райвыканкама Сямён Шапіра. — Знайдзіце чалавека, каб за пэўную плату распальваў кацёл два разы ўдзень: раніцай і вечарам. Дровы ў лясгасе, мяркую, знойдуцца.

Акрамя таго, кіраўнік цэнтральнага рэгіёна парэкамендаваў гаспадарам прадаць жыллё і купіць іншае або памяняць яго на больш цёплае і ўтульнае. «Толькі дарыць яго нікому не трэба. Дом у вас вялікі, каштуе нятанна. Магчыма, яго захоча прыдбаць шматдзетная сям'я», — выказаўся Сямён Шапіра.

— Што тычыцца любанскага дома, то рашэнне суда для мяне, як і любога чалавека, — закон, які належыць выконваць. Я не маю права ўмешвацца ў дзейнасць судовых органаў, — рэзюмаваў старшыня аблвыканкама.

Ды заяўнік стаяў на сваім: «Я прыйшоў на прыём да вас невыпадкова. Вы шчыры і справядлівы чалавек, вы ж губернатар. Зрабіце так, каб прыехаў пракурор».

— Я не магу ўказваць пракурору, магу толькі папрасіць азнаёміцца з вашым пытаннем, — паставіў кропку ў размове Сямён Шапіра.

Як падалося, адказам пенсіянер застаўся задаволены.

І яшчэ адно жыллёвае пытанне даводзілася вырашаць кіраўніку сталічнай вобласці. Юлія Мамчыц з 2007 года мае статус сіраты і стаіць на адпаведнай чарзе. Разам з тым чакаць кватэры давядзецца яшчэ доўга. Дзяўчына працуе поварам, жыве на здымнай кватэры, на аплату якой ідзе значная частка зарплаты. За свае даходы яна не можа пабудаваць жыллё нават з дапамогай ільготнага крэдыту. Сямён Шапіра даручыў старшыні райвыканкама Анатолю Ліневічу вывучыць сітуацыю аб магчымым працаўладкаванні дзяўчыны ў адной з арганізацый, якая мае службовае жыллё.

**Тамцяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Цішэй едзеш...

# СА СТЫХІЯЙ НА «ТЫ»

## Дарожныя службы да зімы гатовыя. А вы?

**Даты ў календары і надвор'е часта не адпавядаюць адзін аднаму. Вось і ў гэтым годзе зіма паспрабавала ўступіць у свае правы ўжо ў пачатку лістапада. Гэта заспела знянацку шматлікіх удзельнікаў дарожнага руху як сярод вадзіцеляў, так і сярод пешаходаў. Як вынік — вялікая колькасць аварый: за мінулыя трохдзённыя выхадныя адбылося 34 ДТЗ, у якіх 11 чалавек загінулі і 35 атрымалі раненні. Пра тое, як звесці да мінімуму наступствы дрэннага надвор'я, расказалі прадстаўнікі ДАІ, дарожных службаў і прадпрыемства «Белтэхагляд».**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ** параіў вадзіцелям не цягнуць са зменай летняй гумы на зімовую. Нягледзячы на тое, што ў Правілах перыяд яе абавязковага выкарыстання абмежаваны рамкамі пары года — з першага снежня па канец лютага, — падумаць пра сваю бяспеку варта загадзя. Як толькі тэмпература ўсталёўваецца на ўзроўні васьмі градусаў цяпла і ніжэй, летняя гума, умоўна кажучы, дзеравянее, што адбіваецца на манеўранасці аўтамабіля. Каб адчуць асаблівасці «паводзін» машыны ў зімовае надвор'е, пасля выпадзення першага снегу варта паспрабаваць рэзка затармазіць на невялікай хуткасці. Розніца з сухім асфальтам будзе каласальная — гэта дапаможа настроіцца на новыя ўмовы.

У сувязі са скарачэннем светлавога дня, а таксама з'яўленнем гурбаў уздоўж дарог павялічваецца колькасць збітых пешаходаў, асабліва ў сельскай мясцовасці. Многія чамусьці да гэтага часу лічаць, што флікеры — гэта забаўкі для дзяцей і падлеткаў. Хоць перамяшчацца без іх у цёмны час сутак уздоўж дарогі амаль тое ж самае, што ўвайсці ў клетку з тыграмі — гэта смяротна небяспечна! Не варта ігнараваць і такія простыя, але важныя правілы: ісці насустрач руху, ні ў якім разе не заходзячы за абмежавальную паласу.

Нярэдка вадзіцелі, якія збіваюць чалавека, знікаюць з месца здарэння. Робяць яны гэта дарэмна, бо калі б замест уцёкаў яны выклікалі хуткую дапамогу і ДАІ, то да адказнасці прыцягнуць не былі б, таму што ў большасці выпадкаў вінаватыя пешаходы. Калі ж вадзіцель збягае, то ён можа быць пакараны за тое, што скрыўся з месца ДТЗ і кінуў чалавека ў небяспецы.

**Калі адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, то пасля выстаўлення знака аварыйнага прыпынку варта неадкладна адысці ад аўтамабіля на абочыну. Ва ўмовах дрэннай бачнасці чалавека на дарозе могуць проста не заўважыць.**

Пры складаных прыродных умовах на службу заступае ўзмоцнены склад супрацоўнікаў ДАІ, якія дзейнічаюць у адпаведнасці з планам «Надвор'е». Аднак пракантраляваць сітуацыю адначасова на ўсіх дарогах немагчыма, таму прадстаўнікі Дзяржаўтаінспекцыі просяць у выпадку выяўлення небяспечных участкаў паведамляць пра іх па нумары 102.

Калі ўзніклі непаладкі з аўтамабілем ці ўмовы надвор'я перашкаджаюць працягваць рух, па дапамогу таксама можна звярнуцца па адзіным нумары дарожнай службы — 125. Як адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Сяргей ЛЯВОНЧЫК,** варта суадносіць неабходнасць паездкі на аўтамабілі з пагрозамі, якім вы можаце сябе падвергнуць. Інфармацыя аб розных узроўнях небяспекі — ад зялёнага да чырвонага — даецца нездарма. І, калі ўзровень пагрозы аранжавы, а тым больш чырвоны, варта некалькі разоў падумаць, перш чым адправіцца ў дарогу. На сайце ведамства можна прасачыць стан дарог па ўсёй Беларусі. Фатаграфіі, якія паступаюць з дарожна-вымяральных станцый, абнаўляюцца кожныя паўгадзіны.

Калі адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, то пасля выстаўлення знака аварыйнага прыпынку варта неадкладна адысці ад аўтамабіля на абочыну. Ва ўмовах дрэннай бачнасці чалавека на дарозе могуць проста не заўважыць.

Да зімовага сезона для ўтрымання дарог рэспубліканскага значэння гатовы 1800 адзінак тэхнікі, з якіх 690 — пескасолеразмеркавальнікі. Закуплена 350 тысяч тон процігалалёдных матэрыялаў і 8 тысяч тон солі ў чыстым выглядзе.

Па словах **намесніка дырэктара прадпрыемства «Белтэхагляд» Міхаіла СВІСТУНА,** у гэтым годзе скарацілася колькасць вадзіцеляў, якія падалі свой аўтамабіль для праходжання гэтай працэдуры. З-за тэхнічных непаладак адбываецца ўсяго каля 1% ад агульнага ліку ўсіх аварый, аднак наступствы ў гэтых выпадках часцей за ўсё вельмі цяжкія. На канец лістапада запланавана дэкада рэйдавых мерапрыемстваў па тэхаглядзе сумесна з ДАІ.

У цэлым, за апошнія 10 гадоў удалося істотна скараціць колькасць людзей, якія гінуць у ДТЗ. Калі ў 2006-м іх было больш за 1700, то летась — 644 чалавекі.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ЧАС СНЕГАВІКА

## На поўначы Беларусі снежнае покрыва ўжо дасягае 26 сантыметраў

**А ў гэтыя выхадныя амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць сапраўдная зіма, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Уначы на чацвер паўднёвы цыклон прынёс нам новую порцыю ападкаў. У многіх раёнах прайшоў моцны снег, і ў большасці рэгіёнаў краіны ўсталявалася снежнае покрыва. Сярэдні паказчык вышыні снегу па краіне складае 1—14 см, па Віцебскай вобласці ён дасягае 15—22 см, па поўначы вобласці — да 26 см. А гэта ўжо зіма. Больш за тое, у наступныя дні стане яшчэ халадней. Спецыялісты ўпэўнены: тэмпературны фон панізіцца і будзе на 5—7 градусаў ніжэй за кліматычную норму, што адпавядае ўмовам надвор'я першай дэкады снежня.

Праўда, сёння надвор'е палепшыцца. Наша тэрыторыя трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, што сфарміравана ў вільготнай халоднай паветранай масе. У асобных раёнах краіны пройдзе невялікі снег. На дарогах чакаецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ў пятніцу складзе мінус 1—6 градусаў, а ў паўднёвых раёнах краіны будзе вагацца ад нуля да плюс 2 градусаў. Лічыцца, што і ў выхадныя надвор'ем будзе кіраваць зона павышанага атмасфернага ціску, якая сфарміравана ў вільготнай паветранай масе паўночных шырот.

Зіма пачне паказваць свой нораў ужо ў суботу, калі ў асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах захаваецца галалёдзіца, а ўначы і раніцай чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 марозу, пры праясненнях чакаецца да мінус 14 градусаў. Зусім не па-лістападаўску будзе і ўдзень, калі прагназуецца ў межах ад мінус 6 градусаў па поўначы да плюс 1 градуса па поўдні Беларусі. У нядзелю ў асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег, месцамі чакаецца туман, на дарогах захаваецца галалёдзіца, а раніцай і ўдзень — слабы галалёд.

Увага! Найбольш у нядзелю не пашанцуе Гомельскай вобласці, дзе чакаецца пагаршэнне ўмоў надвор'я — на большай частцы рэгіёна прагназуецца працяглы снег, раніцай і ўдзень у асобных раёнах моцны снег і мяцеліца. Удзень па паўднёва-ўсходніх раёнах краіны прагназуецца ўзмацненне ветру — парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3—9 градусаў, а ўдзень будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


Фота БЕЛТА.

# Перажылі першы снегапад

**На тэрыторыі краіны на працягу сутак назіраліся неспрыяльныя метэаралагічныя ўмовы, якія праявіліся ў выглядзе снегападу. Затораў на аўтамабільных дарогах зарэгістравана не было, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.**

У Пружанскім і Драгічынскім раёнах выпала 13 і 10 міліметраў снегу адпаведна. У Брэсцкай вобласці падраздзяленні МНС аказвалі дапамогу ў вызваленні са снежных заносаў трох транспартных сродкаў — грузавіка і двух легкавікоў, у якіх знаходзілася пяць чалавек. Убралі ўпаўшыя дрэвы з праезнай часткі. Пацярпелых не было.

На расчыстцы дарог і ўборцы снегу давялося задзейнічаць больш за 2,1 тысячы адзінак тэхнікі і больш за 4,1 тысячы чалавек з розных арганізацый. Па дадзеных «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 144 населеных пунктаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# БЕЛЫ БІМ — НІЧЫЙНАЕ ВУХА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На зваротным шляху шчанюка ў зале я не знайшла. Яго выгналі на вуліцу. Бедная жывёліна ляжала на мокрай траве, дрыжала ўсім сваім знясіленым цельцам ад холаду. Доўга я круцілася вакол яе: узяць — не ўзяць. Дома свае чатырохногія пестуны. Але не хапіла сумлення кінуць жывую істоту паміраць пад плотам. Мая неспадзяваная «знаходка» спала ўсю дарогу. Затым двое сутак адлежвалася ў куце на посцілцы: не ела, не піла. Давялося сілком заліваць цёплае малако. Праз колькі часу шчанюк памацнеў, падужэў, у яго з'явіўся ну проста звярыны апетыт.

І паўстала пытанне: куды ўладкаваць беспрытульніка? Усё яшчэ спадзявалася: раптам знойдуцца былыя гаспадары? Можа, згубілі шчанюка, а можа — збег? Штодзень заглядвала на сайты па пошуку згубленых дамашніх жывёл, адначасова змяшчала аб'явы з фотаздымкам малога ў інтэрнэце, газетах, на радыё. Але ішоў час, і мае надзеі раставалі як кастрычніцкі снег: ніхто не адгукаўся. Звязалася з валанцёрамі, прасіла дапамагчы часова ўладкаваць сабаку, каб у далейшым знайсці яму ўтульны дом і добрага гаспадара. Але яны нічога канкрэтнага мне не абяцалі. Маўляў, зразумейце нас, не можам мы забраць усіх бадзяжных сабак і катоў, не маем для гэтага ні ўмоў, ні сродкаў — на азяванні ўсіх не пракорміш. Акрамя таго, ім патрэбны не толькі корм, але і міскі, посцілкі, ашыйнікі, лекі. І сапраўды, людзі, якія ўзялі на сябе клопат аб няшчасных «братах нашых меншых», не могуць прыняць і абагрэць усіх. Патэлефанавала сябрам, сваякам, знаёмым, нават тым, з кім не бачылася некалькі гадоў, — безвынікова. Усе яны любяць жывёл, і кожны ўжо прытуліў дома не аднаго бадзягу: хто кошку, хто сабаку.

Але дапамога прыходзіць звычайна з таго боку, адкуль не чакаеш. Мая калега патэлефанавала свайму пляменніку і, на дзіва, ён пагадзіўся ўзяць шчанюка. Везла я патэнцыйнаму гаспадару сабаку з вялікім хваляваннем: раптам адмовіцца. Андрэй мне спадабаўся адразу: прыгожы адкрыты твар, шчырая ўсмешка. Яшчэ больш пранікла да хлопца, калі ён спытаў у жывёліны: як цябе клічуць, пойдзем знаёміцца з маёй кошкай? Шчанюк завіляў хвастом, даверліва ўткнуў яму пысу ў калені...

...Мы ў адказе за тых, каго прыручылі, і абавязаны пра гэта помніць. Забойства можа быць і без выстралу. Забойца той, хто здрадзіў. І я ўпэўнена, што яго ў тым, другім жыцці, каля варот пекла сустрэне Цэрбер, які будзе падобны на сабаку, якога той калісьці асудзіў на пакутлівую смерць.

**Тацціяна ГЕОРГІЕВА.**


**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 22 ноября 2016 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 45% после вторых несостоявшихся торгов по продаже объекта недвижимости – здания мехмастерской, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Ковалёва, 130, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Ветковский агросервис» на праве собственности**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, руб. (в т.ч. НДС 20%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание мехмастерской, инв. №311/С-46465** | Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Двухэтажное кирпичное строение, 1969 года постройки. Общая площадь 1613,3 м кв. *Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки.* **Часть здания общей площадью 408,2 м кв. сдана в аренду сроком до 31.12.2016 г.** | **28 287,27** *(Справочно: начальная цена без учета деноминации 282 872 700 бел. рублей)* | **2 828,70** *(Справочно: сумма задатка без учета деноминации 28 287 000 бел. рублей)* |

***Земельный участок** для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **0,4428 га** с кадастровым номером 320850100012000127. Имеются ограничения (обременения) прав в использовании земель: **водоохранная зона водного объекта 0,4428 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.*

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 21 ноября 2016 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **22 ноября 2016 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов. **Шаг аукциона – 5%.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно представляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованную в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 11 ноября 2016 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере – четыре процента от цены продажи лота, сформированной в установленном порядке; в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 20 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона.

*Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 17.10.2015 г. №201, от 06.04.2016 г. №63.*

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: ОАО «Ветковский агросервис», Гомельская обл., г. Ветка, ул. Ковалева, 130. ☎ 8 (02330) 2-11-73, 8 (029) 636-00-87.**

# У грамадстве або ў чатырох сценах?

## Рэалізаваць патэнцыял кожнага

— Для таго каб інклюзіўная адукацыя запрацавала, мы павінны змяніць стаўленне грамадства (а нярэдка і сваё стаўленне) да дзяцей з інваліднасцю, — лічыць **прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Рэспубліцы Беларусь Рашэд МУСТАФА.** — Калі мне кажуць, што дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця не паспяваюць у школе, я звычайна адказваю: няўжо вы самі былі круглымі выдатнікамі па ўсіх прадметах? Пагадзіцеся, што спецыялістамі ў ядзернай фізіцы становяцца толькі адзінкі з вялікай колькасці выпускнікоў, а хтосьці працуе прадаўцом, бухгалтарам і гэтак далей. Дзіця з асаблівасцямі таксама можа стаць высокакваліфікаваным IT-спецыялістам, перакладчыкам, анлайн-рэкруцёрам ці проста зможа навучыцца чытаць, карыстацца камп'ютарам — кожны ў адпаведнасці са сваім патэнцыялам. Але магчымасць рэалізаваць свой патэнцыял павінна быць у кожнага — і ў звычайнага дзіцяці, і ў «незвычайнага». Пакуль, на жаль, у Беларусі ў адносінах да інваліднасці і інвалідаў пераважае медыцынскі падыход, а патрабуецца — сацыяльны. Мы павінны пабудаваць сістэму інклюзіўнай адукацыі шляхам адаптацыі як асяроддзя, так і зместу вучэбнай праграмы, якая будзе ўлічваць інтарэсы ўсіх удзельнікаў навучальнага працэсу: ад настаўніка да вучняў і бацькоў дзяцей з інваліднасцю. **Каму, як не педагогам, быць першымі ў выкараненні стэрэатыпаў?**

З 2014/2015 навучальнага года ў Беларусі рэалізуецца рэспубліканскі эксперыментальны праект па апрабацыі мадэлі інклюзіўнай адукацыі, у якім прымаюць удзел восем сярэдніх школ з усёй краіны. У бягучым навучальным годзе працуюць 20 эксперыментальных інклюзіўных устаноў. Узрастае таксама колькасць устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх створана адаптыўнае адукацыйнае асяроддзе. Калі ў 2013/2014 навучальным годзе іх было 280, то ў 2015/2016 годзе — ужо 951.

— Мы разумеем, як шмат нам трэба зрабіць, але гатовыя да зменаў і разумеем іх неабходнасць, — запэўнівае **намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА.** — Патрабуецца распрацоўка прынцыпова новых дакументаў, якія рэгулююць пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу з улікам інклюзіўных падыходаў. Пры інклюзіі трэба не вучняў з тымі ці іншымі цяжкасцямі ў навучанні адаптаваць пад патрабаванні стандартнай школы, а рэфармаваць установы адукацыі і шукаць іншыя педагагічныя падыходы, каб было магчымым найбольш поўна ўлічваць асаблівыя адукацыйныя патрэбы ўсіх навучэнцаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Цаніць унікальнасць

**Начальнік аддзела спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Антаніна ЗМУШКО** упэўнена, што нельга толькі крышачку палепшыць сістэму і пакінуць пад новай шыльдай ранейшыя падыходы і змест. **Інклюзіўная адукацыя — гэта, найперш, новы светапогляд,** сістэма іншых адносін, дзе прыярытэтам з'яўляюцца не акадэмічныя поспехі вучня, а фарміраванне здольнасці жыць у грамадстве, дзе прызнаецца і паважаецца разнастайнасць, цэніцца унікальнасць кожнага чалавека.

— У цэнтры нашай увагі павінны быць не дэфекты дзіцяці, а яго патэнцыял і магчымасць сацыялізацыі. Аднак для сістэмы адукацыі, у тым ліку і спецыяльнай, гэта няпросты пераход, — канстатуе Антаніна Змушко. — Работа па фарміраванні талерантнасці, інклюзіўнай культуры з'яўляецца, мабыць, адной з найбольш складаных задач. Інклюзія ў адукацыі ставіць шмат неадназначных пытанняў і праблем, над вырашэннем якіх мы працуем, у тым ліку і выкарыстоўваючы багаты міжнародны вопыт

— Калі ў школе асобна арганізаваны заняткі асаблівых і звычайных дзяцей — гэта не інклюзіўнае навучанне. Нават калі на занятках вучні знаходзяцца разам, але пры гэтым не створаны неабходныя ўмовы для іх сумеснага эфектыўнага навучання, то гэта таксама не інклюзіўнае навучанне, — тлумачыць **саветнік па пытаннях інклюзіўнай адукацыі рэгіянальнага бюро ЮНІСЭФ Нора ШАБАНІ.**

## Эфект ад супрацоўніцтва

У Расіі інклюзіўная адукацыя на заканадаўчым узроўні ўпершыню была замацаваная яшчэ ў 2012 годзе. У новым Законе «Аб адукацыі» прапісалі правы і абавязкі бацькоў і дзяцей пры атрыманні інклюзіўнай адукацыі.

— Мы працуем у гэтым кірунку ужо пяць гадоў, і ў нас з'яўляецца ўсё больш школ, дзе робіца ўсё для таго, каб інклюзія перастала быць проста лозунгам, а стала рэальнасцю, — расказаў **дырэктар Інстытута карэкцыйнай педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі, акадэмік Мікалай МАЛАФЕЕЎ.** — Разам з тым мы не лічым (ва ўсялякім выпадку на гэты момант), што сетка спецыяльных школ павінна быць згорнутая, што бацькі ці дзеці камусьці штосьці павінны.



А вось дзяржава абавязана прадастаўляць тыя адукацыйныя паслугі, якія заказваюць бацькі. І калі хтосьці хоча, каб яго дзіця навучалася ва ўмовах не агульнаадукацыйнай, а карэкцыйнай школы — мы павінны ім забяспечыць такую магчымасць. Карэкцыйная педагогіка яшчэ цалкам сябе не зжыла. Затое з'явілася сістэма ранняй дапамогі, якая раней была немагчымая. Дзяржаве яна была непатрэбная, а бацькі не разумелі яе каштоўнасць. Многія і зараз не спяшаюцца прызнаць у свайго дзіцяці праблему, цягнуць з яе канстатацыяй да трох—чатырох гадоў і звяртаюцца да спецыялістаў, на жаль, з вялікім спазненнем. Калі бацькі матываваныя, мы бачым, якіх фантастычных вынікаў можна дасягнуць у першыя тры гады жыцця дзіцяці пры ранняй карэкцыйнай дапамозе. Па-першае — гэта сацыяльны эфект: дасведчанасць бацькоў у пытаннях выхавання і рэабілітацыі свайго дзіцяці дасягае 90—95 працэнтаў. Ад 30 да 35 працэнтаў дзяцей з цяжкімі генетычнымі парушэннямі застаюцца ў сваёй сям'і, тым самым змяншаецца колькасць дзяцей-сірот. Па-другое, рэабілітацыйны эфект: да сямі гадоў у 50—55 працэнтаў дзяцей развіццё набліжаецца да ўзроставай нормы, і яны ідуць вучыцца па агульным стандарце,ім не патрабуецца спецыяльная школа. Такім чынам адзін рубель, укладзены ў рэабілітацыю дзіцяці ў раннім узросце, эканоміць пазней тры рублі.

На думку Мікалая Малафеева, бацькі атрымалі вельмі вялікія правы і гэта добра, але трэба, каб яны разумелі, што ў іх ёсць і абавязкі. Сёння спецыялісты гавораць бацькам: «У вашага дзіцяці ёсць праблема, але толькі вы можаце дапамагчы нам у яе выпраўленні». «Наша з вамі задача — агучыць усе магчымыя шляхі з іх наступствамі, каб бацькі маглі зрабіць усвядомлены выбар. Хацелася б, каб як мага больш дзяцей мелі магчымасць вучыцца ва ўмовах інклюзіі і выходзіць са школы паўнавартаснымі грамадзянамі, абсалютна незалежнымі і здольнымі прымаць самастойныя рашэнні», — дадаў ён.

Дарэчы, знакаміты беларускі педагог, заснавальнік гуманнай педагогікі Леў Выгоцкі яшчэ ў 20-я гады мінулага стагоддзя сказаў, што **школа для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя (нават пры ўсіх сваіх вартасцях) заключае вучня ў замкнёнае асяроддзе, дзе ўсё прыстасаванае пад дэфекты дзіцяці.** Школа, замест таго каб выводзіць дзіця з гэтага ізаляванага свету, развівае ў ім навыкі, якія вядуць да яшчэ большай ізаляцыі.

## Выхад з ізаляцыі

У Гомельскай вобласці ў інавацыйным праекце па ўкараненні інклюзіўнай адукацыі ўдзельнічаюць два цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі і дзве установы дадатковай адукацыі: Акцябрскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі і Гомельскі абласны палац творчасці дзяцей і моладзі. Прычым гэтыя установы дэманструюць інавацыйны досвед інклюзіі дзяцей, якія маюць множныя парушэнні ў развіцці, у тым ліку расстройствы аўтыстычнага спектру. Удзельнікі праекта папярэджваюць: каб такі досвед насамрэч стаў паспяховым і не сказіў ідэю інклюзіі, трэба загадзя рыхтаваць і дзяцей, і дарослых да таго, што ў іх сацыяльнае і прафесійнае жыццё ўвойдуць людзі з асаблівасцямі ў развіцці.

Напрыканцы навучальнага года ў абласным Палацы творчасці дзяцей і моладзі праводзілася анкетаванне навучэнцаў, якія наведваюць аб'яднанні па інтарэсах. «Чым ты асабіста можаш дапамагчы дзецям з аўтызмам?» — пацікавіліся ў дзяцей. 37 працэнтаў рэспандэнтаў адказалі: «Трэба паспрабаваць зразумець прычыну», а 63 працэнты — «Трэба паспрабаваць пасябраваць з равеснікам, у якога аўтызм». Вось такі вынік усяго аднаго года ўзаемадзеяння.

Дарэчы, у 2008 годзе ў афіцыйным дакуменце ААН было сказана, што **аўтызм стаў адной з самых сур'ёзных праблем у сферы аховы здароўя ва ўсім свеце, нароўні з ракам, дыябетам і ВІЧ/СНІД.** У Польшчы ў 2013 годзе ўрад зацвердзіў Карту правоў людзей з аўтызмам, у якой гаворыцца, што асобы з аўтызмам маюць права на незалежнае, самастойнае і актыўнае жыццё і не могуць падвяргацца дыскрымінацыі.

— Звычайна бездакорны знешні выгляд дзяцей з аўтызмам узмацняе негатыўную рэакцыю на іх навакольных, паколькі «звонку» такія дзеці выглядаюць здаровымі, а бацькоў звычайна абвінавачваюць у тым, што іх дзеці «непаслухмяныя», «разбэшчаныя», «дзіўныя», і гэта прыводзіць да таго, што тыя адчуваюць няёмкасць, сорам і стомленасць, — кажа **дырэктар Дыягнастычна-тэрапеўтычнага цэнтра для дзяцей з аўтызмам Марта ЛУКОЎСКА-АЛМАШЫ.** — Самая частая рэакцыя на дзяцей з аўтызмам і іх сям'ю — ізаляванне і сацыяльная дыстанцыя. Бацькі часцей за ўсё таксама выбіраюць менавіта гэты спосаб для перададолення стрэсу. Яны ўстрымліваюцца ад сумеснага наведвання грамадскіх месцаў, каб пазбегнуць адмоўнай рэакцыі з боку іншых людзей, а гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да таго, што ў дзяцей не выпрацоўваюцца навыкі і ўменні правільных паводзінаў у розных сацыяльных сітуацыях. Задачы, пастаўленыя дзяржавай, у значнай ступені вырашаюцца актыўнай дзейнасцю недзяржаўных фондаў і асацыяцый. Адна з такіх арганізацый у Польшчы — асацыяцыя Wspolny Swiat — распрацавала і ўвяла праграму «Я знаёмлюся са светам, свет знаёміцца са мной». Праграма рэалізоўвалася цягам года, і яе вынікам сталі адэкватныя паводзіны дзяцей і моладзі ў розных сітуацыях, у грамадскіх месцах, набыццё ўмення ўстанаўліваць стасункі з дапамогай альтэрнатыўных метадаў камунікацыі (50 працэнтаў удзельнікаў праекта былі людзьмі, якія ўвогуле не размаўляюць, а кантактуюць з навакольнымі людзьмі выключна з дапамогай сімвалаў на карцінках). У бацькоў у значнай ступені зменшыўся стрэс, была заўважана «прыязнасць» персаналу ў «знаёмых» месцах. Такім чынам, першыя вынікі праграмы, скіраванай на набыццё сацыяльных уменняў, аказаліся абнадзейваючымі.

Увогуле ў Еўропе і Амерыцы аўтысты нярэдка займаюцца высокакваліфікаванай працай, і ніхто ўжо не ўспрымае іх як людзей з інтэлектуальнай недастатковасцю. У Беларусі сёння пражывае каля 10 тысяч дзяцей з аўтызмам, пры гэтым лічыцца, што статыстыка адлюстроўвае толькі кожны дзясяты выпадак. Да 90 працэнтаў дзяцей з аўтызмам за мяжой навучаюцца ў сістэме інклюзіўнай адукацыі, а ў нас 90 працэнтаў наогул застаюцца дома. Толькі адзінкі з падлеткаў паступаюць у вучылішчы і, як правіла, іх не заканчваюць.

Ёсць над чым думаць і працаваць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**«Слоўнік талерантнасці», складзены намаганнямі навучэнцаў і педагогаў сярэдняй школы № 1 горада Салігорска. Як казаць правільна:**

**Дзіця з інваліднасцю, а не чалавек з недахопам здароўя, хворы ці непаўнавартасны.**
**Дзіця з парушэннямі зроку, а не сляпое.**
**Дзіця з парушэннямі слыху, а не глухое ці глуханямое.**
**Дзіця з асаблівасцямі развіцця, а не прыдуркаватае.**
**Дзіця ў калясцы, а не паралізаванае, прыкаванае да каляскі.**
**Дзіця з сіндромам Даўна, а не даўн, з хваробай Даўна.**

# ДЗЕСЯЦЬ ГАДЗІН ПА ПОЯС У ЛЕДЗЯНОЙ ВАДЗЕ

## Паляўнічага, які прапаў у Камянецкім раёне, знайшлі ў зарослым калодзежы

**32-гадовы жыхар Камянца пайшоў на паляванне на качку ў другой палове дня, жонцы сказаў, што дома будзе каля сямі вечара. Калі малады чалавек не з'явіўся дома апоўначы, родныя сталі біць трывогу. Першым у міліцыю аб прапажы пляменніка паведаміў яго дзядзька, потым з такой жа заявай патэлефанавала жонка паляўнічага.**

У Камянецкім РАУС стварылі некалькі пошукавых груп, бо сваякі Дзмітрыя З. дакладна не ведалі, куды ён накіраваўся на паляванне. Як паведаміў **намеснік начальніка Камянецкага РАУС Сяргей ПАНАСЮК,** пошукі працягваліся ўсю ноч, і каля чатырох раніцы ў зарослым калодзежы каля вёскі Радасць знайшлі чалавека, які стаяў па пояс у ледзяной вадзе.

Ён патлумачыў, што не заўважыў калодзеж у высокай траве і праваліўся. Выбрацца адтуль самастойна не змог, а мабільны тэлефон на глыбіні сем метраў не лавіў сетку. Яго паляўнічы сабака пабегаў нейкі час вакол, а потым скочыў уніз да гаспадара. Так і сталі чалавек і сабака ў спадзяванні на дапамогу доўгія дзесяць гадзін.

Дзмітрыя шпіталізавалі з дыягназам пераахаладжэнне ў раённую бальніцу. Як расказалі карэспандэнту газеты ў Камянецкай раённай арганізацыі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, зараз ён знаходзіцца на лячэнні. А таварышы гавораць, што ў кашулі нарадзіўся. Калі б ён прастаяў у вадзе даўжэй, наступствы для здароўя былі б яшчэ больш сур'ёзныя.

У гэтай арганізацыі таксама наракалі на праблему закінутых калодзежаў. На тым месцы, каля вёскі Радасць Відамлянскага сельсавета, некалі быў хутар. Дом даўно знеслі ці разабралі, а калодзеж застаўся. І такіх калодзежаў па Камянецкім раёне застаецца нямала, сцвярджаюць паляўнічыя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Сацыяльны клопат

# Каб абараніць пажылых

**У Мінскай вобласці ў лістападзе і снежні аб любых супрацьпраўных дзеяннях у дачыненні да пажылых можна будзе паведаміць ананімна, скарыстаўшыся паштовай скрыняй. Гэта — сумесная акцыя УУС Мінскага аблвыканкама і Мінскага філіяла «Белпошты».**

— Мы прапануем проста апусціць у паштовую скрыню адпаведнае пісьмовае паведамленне міліцыі — нават без канверта і паштовай маркі. Пасля вымання карэспандэнцыі паштовыя работнікі перададуць такога кшталту лісты або запіскі кіраўніцтву райаддзела ўнутраных спраў для аператыўнай праверкі, — растлумачыў «Звяздзе» **начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Аляксандр КІСЕЛЬ.** — Але ў адрасаваных такім чынам пасланнях павінна быць інфармацыя аб тым, якое правапарушэнне здзейснена, па якім адрасе... Прычым такім спосабам да нас могуць звяртацца не толькі самі пажылыя, але і неабыякавыя людзі: суседзі, сваякі, знаёмыя. Усе паведамленні мы будзем правяраць і належным чынам рэагаваць на іх.

Справа ў тым, што пажылыя людзі ў вёсцы не заўсёды маюць магчымасць патэлефанаваць у міліцыю і паведаміць аб правапарушэнні. А паштовыя скрыні ёсць практычна ва ўсіх населеных пунктах, і паштовыя работнікі вымаюць карэспандэнцыю з іх строга па графіку. Ды і пажылым людзям карыстацца паштовай скрыняй звыкла і зручна.

— Мы разлічваем на эфектыўнасць гэтай ініцыятывы і заклікаем грамадзян не заставацца абыякавымі да праблем пажылых людзей, — кажа Аляксандр Кісель. — Да таго ж такім чынам можна паведамляць не толькі аб правапарушэннях. У паштовыя скрыні можна апускаць інфармацыю і аб іншых праблемах пажылых грамадзян.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ За кадрам

# Сто гадоў і восем серый

## «Звязда» пабывала на здымках фільма да юбілею беларускай міліцыі

Апоўдні, лёгкі марозік і дробны снег. Уздоўж вуліцы — адной з нямногіх, што захаваліся ў старым цэнтры Мінска амаль у нязменным выглядзе — ідуць чырвонаармеец, самавіты мужчына ў паліто і прывабная паненка з кардонкай для капелюшоў. Ля вітрыны мануфактурнай крамы прыпынілася нейкая архаічная фурманка. Словам, пераследуе адчуванне, нібыта ты выпадкова праваліўся ў глыбіню гісторыі гадоў гэтак на сто.

— Самае цікавае — штурм будынка паліцыяй, стралянiну, біццё вокнаў — вы ўжо прапусцілі, — гавораць нам пры сустрэчы. — Сёння, бачыце, будзе абрабаванне.

— Нічога, — пагаджаемся, — нам і абрабаванне падыдзе.

ГЭТЫ дыялог, што нагадвае збоку злёт аўтараў дэтэктыўных раманаў, — насамрэч звычайная справа для здымачнай пляцоўкі, дзе творчая каманда Агенцтва тэленавін пры падтрымцы Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі ўжо не першы тыдзень працуе над тэлевізійным праектам да 100-годдзя беларускай міліцыі. Фільм, які мае рабочую назву «Міліцыя ў асобах», будзе складацца з 8 серый па 26 хвілін, дзе знойдзецца месца для мастацкай рэканструкцыі гучных крымінальных спраў, экранізацыі лёсаў адметных асоб, успамінаў сведкаў і ўдзельнікаў, а таксама для архіўных кадраў і сучаснай хронікі. Таму назваць гэты шматсерыйны праект выключна дакументальным фільмам не выпадае, наогул адназначна назваць ягоны жанр няпроста, але тэлевізійнікі запэўніваюць: будзе цікава і ўражліва. «Звязда», скарыстаўшыся момантам, зазірнула па той бок экрана і падгледзела некаторыя інтрыгі сюжэта.

— Канцэпцыя кожнай асобнай серыі пабудавана на трох гісторыях, звязаных з пэўным перыядам станаўлення беларускай міліцыі, — пакуль аператар «прыстрэльваецца», праводзіць для нас інфармацыйны лікбез **адзін са сцэнарыстаў праекта Руслан ТУРКОЎ**. — Напрыклад, першая серыя, аўтарам якой я непасрэдна з'яўляюся, ахоплівае перыяд з 1917 года да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Тут мы ўзгадваем, па-першае, пра нараджэнне беларускай міліцыі наогул — калі на пасаду кіраўніка Мінскай гарадской міліцыі прыйшоў Міхаіл



Загружаць фурманку кіношным бандытам даялося не раз і не два.

Фрунзэ. Раскрыю сакрэт: мы нават вялі перамовы з дачкой і ўнукам Фрунзэ, каб аздобіць сухія факты жывымі ўспамінамі. Але, на жаль, сваякі спаслаліся на яе нямоглaсць і агульны стан здароўя (дачцэ Фрунзэ ўжо за 90 год. — **Аўт.**), таму сустрэча з ёй не ўдалося. Другая гісторыя датычыцца вядомага ў сваіх колах начальніка крымінальнага вышуку Ільюкевіча, які, уявіце, праслужыў на сваім месцы пры трох уладах — царскай, польскай і савецкай, і паўсюдна быў запатрабаваны як выдатны прафесіянал. Трэцяя частка распавядзе пра лёс кіраўніка крымінальнага вышуку Чэрыкаўскага павета Міхайлоўскага — малады хлопец, якому было ўсяго 24 гады, распачаў непрымірымую барацьбу з бандытамі. Тыя выманілі яго ў глухія мясціны, забіўшы вясковага школьнага настаўніка; Міхайлоўскі паехаў расследаваць гэту справу, але трапіў у засаду, яго катавалі і застрэлілі, забраўшы дакументы і нават вопратку, каб скарыстаць яе надалей, калі спатрэбіцца прыкрыццё, — але неўзабаве злачынцы былі знойдзены і затрыманы. Паралельна з гэтымі трыма гісторыямі мы раскажам пра бытавы бок жыцця першых беларускіх міліцыянераў: якое ў іх было абмундзіраванне і зброя, як ставілася да іх звычайнае, грамадзянскае насельніцтва, якой наогул была сітуацыя ў краіне... Але цалкам змест серыі расказваць не буду, бо вам потым глядзець будзе нецікава.

**9 лістапада канал «Беларусь 1» паказаў спецыяльны рэпартаж — «Гісторыя міліцыі — у асобах. Фільм пра фільм», дзе сцэнарысты, рэжысёры, аператары, карэспандэнты Агенцтва тэленавін і прадстаўнікі МУС расказалі, якім абяцае стаць гэты маштабны тэлепраект. Сам жа фільм з'явіцца на тэлеэкранах у студзені 2017 года і фінішуе 4 сакавіка, у Дзень міліцыі.**

УЛАСНА, сёння ў Верхнім горадзе, у сэрцы Мінска, здымаецца рэканструкцыя нашумелага рабавання 1920 года, якое даследаваў вядомы беларускі сышчык Аляксандр Ільюкевіч. Злачынства было адначасова геніяльна простым і дзёрзкім: напачатку лютага на Саборнай плошчы злодзеі абрабавалі мануфактурную краму «Оксенкруг», куды пранiклі праз будынак былога Камерцыйнага банка, прабіўшы адтуліну ў сцяне, а ўкрадзенае тут жа, сярод белага дня, вынеслі на падводу пад відам грузчыкаў і з'ехалі... Ільюкевіч, дарэчы, даверыўшыся ўласнаму вопыту ды інтуіцыі і супаставіўшы факты, раскрыў гэта злачынства на працягу некалькіх дзён і выкрыў банду заезджых рабаўнікоў. У нашым жа выпадку бягучы лістапад паспяхова спраўляецца з «роляй» былога лютага: завею забяспечвае дыммашына, Музычны завулак паказвае сваю гістарычную тоеснасць пачатку XX стагоддзя, а маладыя беларускія акцёры ўвасабляюць тагачасных гараджан, патрульных міліцыянераў і ўласна бандыцкую хеўру, якая нетаропка грузіць на фурманку загадкавыя цюкі і пакункі.

— Ці многа ва ўсім, што ўбачаць гледачы на экране, будзе мастацкай выдумкі, або, наадварот, вы імкнуліся да дакументальнай дакладнасці? — уражаная абсалютна паўсядзённым выглядам «бандытаў», распытваю сцэнарыста.

— Падрыхтоўчы перыяд быў вельмі складаны, шмат чаго даявлося ўзгадняць з гісторыкамі Акадэміі МУС, шукаць у Нацыянальным гістарычным архіве, у музеі МУС, штосьці разведваць у інтэрнэце, прычым значная колькасць знойдзеных дакументаў супярэчылі адзін аднаму — даводзілася супастаўляць, пераправяраць па некалькі разоў. Каб не дапусціць «ляпаў» і праліках, надавалі вялікую ўвагу дэталям: напрыклад, я ведаю, што мануфактурная крама гандлюе тканінамі — але на ўсякі выпадак



Героі фільма нібыта выйшлі ў сучасны горад проста з мінулага стагоддзя.

перачытаў шмат дадатковай літаратуры, пераглядзеў дакументальныя фільмы: ці на самай справе прадавалася толькі сукно, альбо можна было і тытунь набыць ці яшчэ нешта, ці выкарыстоўваўся ў назве крамы «ять» — аказваецца, ужо не, і гэтак далей. «Пералапацілі» процьму інфармацыі, і ўсё адно застаўся вялізны некрануты пласт... Натуральна, па магчымасці мы стараліся ўплятаць у фільм не толькі дакументальныя рэчы і расказы гісторыкаў — чым бліжэй да нашых дзён, тым больш будзе сведкаў тых ці іншых падзей. А дзе захоўваюцца «белыя плямы», там, абапіраючыся на факты, штосьці і дадумваем. Шчыра кажучы, калі сваю частку сцэнарыя я аддаваў на ўзгадненне гісторыкам і кансультантам МУС, то вельмі хваляваўся, што ўсё будзе выкраслена і парэзана. Але папраўлі яны ў выніку толькі ўласныя інтэрв'ю.

Пакуль мы абмяркоўваем праект, «рабаванне» паўтараецца. Гэта ў кіно падобныя рэчы адбываюцца імкліва — крадзяжы, пагоні, перастрэлкі, а на самай справе здымачны працэс — справа працяглая, можа спатрэбіцца і два, і пяць, і восем дубляў адной і той жа сцэны з розных ракурсаў, пакуль вынік не задаволіць рэжысёра Марыю Жукаву. «Во праца ў людзей: пагрузіў — разгрузіў, пагрузіў — разгрузіў, і так да вечара», — спачувальна адзначаюць будаўнікі, якія працуюць у адным з суседніх дамоў. Але ніхто з «гараджан» і «бандытаў» не скардзіцца, хоць мароз адчувальна прыхоплівае пальцы і шчокі. Прычына такой цярплівасці хутка робіцца зразумелай: рэжысёр абвяшчае, што сцэна знятая, і амаль усіх адпускае на абед.

Цяпер у працу ўключаюцца іншыя акцёры — «шпік», «патрульныя» і спакойная кабылка, якой трэба выканаць ролю «міліцэйскага транспарту». ...Трэба бачыць твары мінчан, якім насустрач па брукаванцы імкліва скача вершнік у старым шынялі ды з вінтоўкай! «Гэта ж кіно?» — асцярожна ўдакладняюць у нас дзяўчаты, па выгляду студэнткі. — «Гэта жыццё!» — запэўнівае памочнік рэжысёра і гучна просіць усіх ісці па супрацьлеглым баку вуліцы, каб не трапіць «на вочы» тэлекамеры. Тым часам сышчык, гэткі пiжоністы беларускі Пуаро (між іншым, маркуючы па фота, вельмі падобны на свайго прататыпа Ільюкевіча), распытвае вершніка, ці бачыў той штосьці падазронае, і, атрымаўшы адмоўны адказ, ідзе ўніз па вуліцы — думу думаць. Пра што думае? Гэта, на жаль, нават для журналістаў пакуль што застаецца па-за кадрам.

АКРАМЯ Верхняга горада, у фільм трапіла сталічная вуліца Карла Маркса, дзе ў 1917-м размяшчаўся будынак паліцыі, а ў нашы дні адбываўся яго тэлевізійны «штурм», інтэр'еры гатэля «Мінск», Строчыцы (Музей народнай архітэктуры і побыту), дзе здымалася гісторыя забойства Міхайлоўскага, чыгуначны вакзал Брэста, які ў 1941 годзе разам з вайскоўцамі абаранялі міліцыянеры, і шмат чаго яшчэ. Аўтары праекта абяцаюць не абмінуць увагай ніводны значны эпізод гісторыі, ад пасляваеннага разгулу бандытызму да аварыі на Чарнобыльскай АЭС і гучных спраў нашых дзён.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*tselyashuk@zviazda.by*

**Міністэрства ўнутраных спраў значна дапамагае ў рабоце: у здымках задзейнічаны курсанты Акадэміі МУС, з музейных запаснікаў прывозяць абмундзіраванне і захаваныя «рэчдоказы» крымінальных спраў. Каманда Агенцтва тэленавін, са свайго боку, імкнецца зрабіць як мага больш рэалістычнай і відовішчнай мастацкую рэканструкцыю: падбірае натурныя пляцоўкі і інтэр'еры для здымак, скарыстоўвае сучасную тэхніку (наваколле ў Строчыцах здымалі з дапамогай квадракоптара), падбірае для кожнага персанажа максімальна падобных акцёраў (з акцёра Алега Коца, кажуць, атрымаўся выліты Фрунзэ).**



У чаканні свайго выхаду на сцэну кабылка і «патрульныя міліцыянеры» з задавальненнем пазіруюць перад камерамі.



А вось і сышчык!

## Серада, 16 лістапада

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Залатая краіна».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Гетэры маёра Сакалова».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.10** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**9.35, 18.35 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.25, 20.55** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.20, 17.00 Серыял «Мая выдатная нянька».**
**11.55, 17.40 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.50, 19.40** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.10 Дэтэктыў «Трынаццаць».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.15 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.05 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.05** «Беларуская кухня». Бабіна каша.
**8.05, 11.25, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.10 «Доктар Жывага». Драма.**
**9.05, 15.05 «КосцяНіка. Час лета». Меладрама.**
**10.45, 16.40** М/ф.
**10.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці літаратара, сцэнарыста, рэжысёра анімацыі Алега Белавусава.
**11.40** «Наперад у мінулае».
**12.30** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.00, 21.20 «Закаханы па ўласным жаданні». Меладрама.**
**14.25, 20.00** «Аляксандр Суворaў. Усе бітвы генералісімуса».
**16.55** «Камертон». Спявак і кампазітар Ігар Карнялюк.
**17.20, 22.45** «Дыя@блог». Пра прыгожае.
**17.45** «У гасцях у Барыса Аверына».
**19.00 «Гваздзік». Драма.**
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.55, 19.15, 22.50** PRO спорт. Навіны.
**8.05** Спорт-кадр.
**8.35** Авертайм.
**9.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**9.35** Баскетбол. Еўраліга. ЦСКА (Масква) — «Рэал» (Мадрыд, Іспанія).
**11.15** Самба. Чэмпіянат свету.
**13.55** Хакей. КХЛ. «Мядзвешчак» (Заграб) — «Дынама» (Мінск).
**15.50** Валейбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 3-і кваліфікацыйны раўнд. Першы матч. «Мінчанка» (Беларусь) — «Эджаджыбашы» (Турцыя).
**17.55** Козел пра футбол.
**18.15** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**18.45** Слэм-данк.
**19.25** Баскетбол. Еўракубак. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Пардубіцэ» (Чэхія).
**21.15** Баскетбол. Еўраліга. «Дарушшафака» (Турцыя) — ЦСКА (Масква).
**23.00** Баскетбол. Еўраліга. «Рэал» (Мадрыд, Іспанія) — «Панацінайкас» (Грэцыя).

### АНТ

**6.00, 6.30, 07.00, 07.30, 8.00** (з субцітрамі), **08.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Таямнічая страсць».**
**22.55** «25 гадоў пасля СССР».
**23.40** «Вячэрні Ургант».
**0.20 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».**
**2.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.55 Маст. фільм «Хвіліна маўчання».**
**1.35** «Дакументальны праект»: «Загадкі Сусвету».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.00, 2.10** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Разлучніца».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Трохі не ў сабе».**
**16.10** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**22.00 Маст. фільм «Парніковы эфект».**
**23.45 Маст. фільм «Бобі».**
**2.45 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Сваты».**
**19.10, 20.40 Серыял «Шапавалаў».**
**21.45, 23.10 Серыял «Чорная котка».**
**23.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.00** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Сышчыкі».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Брат за брата».**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Марскія д'яблы».**

### 8 канал

**6.30** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Камедыя «Доктар Дулітл».**
**12.35** Дак. цыкл «Як ствараліся імперыі. Візантыя».
**13.15 Серыял «Цяжкі пясок».**
**14.10 Меладрама «Марока».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Золата маўчання».
**17.00 Серыял «Крык савы».**
**17.55 Серыял «Чалавек у высокім замку».**
**18.45** «Мой любімы гадаванец».
**19.20 Серыял «Візіцёры».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Падзенне».**
**23.05 Серыял «Закон і парадак».**

---

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Машкіны страшылкі».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонін».
**9.40** Камедыя «Фартуна Вегаса».
**11.40, 14.40, 19.10** Серыял «Кухня».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Два бацькі, два сыны».
**15.50, 20.20** Серыял «Маладзёжка».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**21.30** Меладрама «Махляры».
**23.20, 5.00** Серыял «Тут некта ёсць...»
**0.20** Серыял «Бязмоўны сведка».
**2.20, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.20** «Каломба». Серыял.
**12.50** «Балахонскі манер». Дак. фільм.
**13.05** «Пешшу...» Масква заалагічная.
**13.35** «Вольга Сяргееўна». Серыял.
**14.45, 21.45** Сусветныя скарбы.
**15.10** Урокі рускай. Чытанні. М. Гоголь. «Запіскі вар'ята».
**15.40** Да 90-годдзя з дня нараджэння Катэ Махарадзэ. «Больш, чым каханне». Сафіко Чыаурэлі і Катэ Махарадзэ.
**16.20** Штучны адбор.
**17.05** «Станіслаўскі і ёга». Дак. фільм.
**17.50** Вялікія імёны Вялікага тэатра. Ірына Архіпава.
**18.35** «Эдгар По». Дак. фільм.
**18.45** Жыццё цудоўных ідэй. «Злавіць няўлоўнае і ўзважыць бязважкае...»
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** «Вольга Якаўлева... Якая ёсць». Дак. серыял.
**22.00** Улада факта. «Дэмаграфічны фактар гісторыі».
**22.45** «Барыс і Вольга з горада Сонца». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Урокі рускай. Чытанні. А. Пушкін. «Паненка-сялянка».
**1.50** «Ціха Браге». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.10** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Рэстаранная культура». 2005 год.
**7.05, 8.40, 9.40, 11.00, 12.40, 13.25, 14.45, 15.40, 17.00, 18.40, 19.25, 20.35, 21.40, 23.00, 23.30, 0.40, 2.05** Музычная настальгія.
**7.40, 13.40** Маст. фільм «Прыгоды Пятрова і Васечкіна».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.15, 17.10** «Смеяться, право, не грешно...»
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Закрытыя гарады і іх насельнікі». 2007 год.
**13.00** «Чалавек і закон». 1987 год.
**18.00** «Спяём, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год.
**19.10** Маст. фільм «Не самы ўдалы дзень».
**23.20** «Мастак і паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы». 1-я частка. 2005 год.
**0.00** Канцэрт гурта «Машина времени». 1990 год.
**1.00** «Весёлые ребята». 1985 год.
**2.20** Маст. фільм «Журналіст».

### EuroSport 1

**3.00, 21.30** Watts.
**3.30, 7.00, 10.30, 15.00, 22.00** Снукер. Northern Ireland Open.
**5.00, 11.45, 14.00, 1.00, 2.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-20).
**6.30** Футбол. «ФІФА».
**9.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**9.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**20.30** Формула Е. Маракеш.

### Кінакамедыя

**0.25** Камедыя «Усё пуцём!»
**2.10** Камедыя «Бінга Бонга».
**4.00** Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».
**5.35** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле».
**7.10** Камедыя «Каханне ўразнос».
**8.40** Меладрама «Пенелопа».
**10.30** Камедыя «Таткі без школьных звычак».
**12.15** Меладрама «Каханне без перасадак».
**14.00, 14.45, 15.35, 18.10** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Няўлоўная чацвёрка».
**18.30** Камедыя «Тата напракат (2 серыя)».
**19.30** Камедыя «Снеданне ў таты».
**21.10** Камедыя «Бамбіза Салман».
**22.55** Камедыя «Ні хвіліны спакою».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І...»
**8.20, 18.50, 2.55** «Асколкі». Серыял.
**10.00, 4.25** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.45** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**14.50** «Ёсць адзін сакрэт».
**15.20** «Здзелка».
**15.55** «Жанна, пажані».
**16.50, 21.45** «Рэвізора».
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.40, 2.00** «Магазіна».
**22.45** «Вялікія пачуцці».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Вады сланам!» Драма.

### ТБ1000

**6.10, 17.55** Меладрама «Іспанская — англійская».
**8.20** Меладрама «Версальскі раман».
**10.20** Фантастыка «Дзяўчына з вады».
**12.15** Меладрама «Снежанскія хлопчыкі».
**14.05** Вестэрн «Цёмная даліна».
**16.00** Трылер «Эфект матылька».
**20.10** Меладрама «Двайное жыццё Чарлі Сан-Клаўда».
**22.10** Камедыя «Лак для валасоў».
**0.15** Трылер «Страчаны рай».
**2.20** Драма «Баец».
**4.20** Камедыя «Маленькая чорная кніжка».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
**7.50** Драма «Класс карэкцыі».
**9.25** Камедыя «Пятніца».
**11.00** Баявік «На гульні 2. Новы ўзровень».
**18.25** Трылер «Халодны фронт».
**20.20** Камедыя «У стылі jazz».
**22.10** Драма «Жыць».
**0.35** Камедыя «Бясслаўныя прыдуркі».
**2.40** Камедыя «Пра што яшчэ гавораць мужчыны».
**4.40** Фантастыка «Індыга».

### National Geographic

**6.00** Зборнік «Гульняў розуму».
**6.40, 9.05, 13.10, 17.00, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.30, 13.55** Сапраўдны суперкар.
**8.20, 14.40** Аўта-SOS.
**10.05, 18.00** Шырокі погляд.
**10.50** Дзікі тунец.
**11.35, 15.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.20, 20.10** Гульні розуму.
**16.10, 19.30, 23.20, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.
**18.45, 2.30** 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё.
**21.00, 0.50, 4.00** Золата Юкана.
**21.45, 1.40, 4.45** Незвычайныя промыслы.
**22.30** Амерыканскае зацямненне.
**0.05** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00, 14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 13.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Багажныя войны.
**11.00** Паляўнічы на антыкварыят.
**12.00** Металаломшчыкі.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Паляўнічыя на зброю.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Што было далей?
**1.30, 6.45** Звышчалавечая навука.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

---

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Пазбягайце мітусні і паспрабуйце максімальна выкарыстоўваць магчымасці і шанцы, якія дае жыццё. Ваша папулярнасць расце, вы патрэбны ўсім — і на працы, і дома. Нават тыя знаёмыя, пра якіх вы ўжо амаль забыліся і якія таксама забыліся пра ваша існаванне, могуць раптам аб'явіцца, патэлефанаваць, прыйсці ў госці, прынесці падарункі ці чакаць ад вас паслугі. Гэта добры знак, так што не адмаўляйце ім ва ўвазе.



**ЦЯЛЕЦ.** Займацца тым, што вы запланавалі на гэты тыдзень, можа аказацца складана, таму лепш адразу падрыхтавацца да некаторых магчымых змен у планах. Не выключана, што ў першую палову тыдня давядзецца выдаткаваць шмат часу на рашэнне чужых праблем. Пачынаючы з аўторка, накіруйце энергію ў стваральны ход — тады адчуеце сваю значнасць і незаменнасць. Для дасягнення мэт варта праявіць уступлівасць — гэта дазволіць нейтралізаваць перашкоды, якія ўзнікаюць на вашым шляху.



**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень будзе напоўнены падзеямі і ўражаннямі. Вельмі спатрэбіцца ўменне рабіць правільныя высновы з хуткасцю маланкі. Пастарайцеся быць больш праўдзівымі з сабой — гэта якасць дазволіць стаць гаспадаром многіх сітуацый. У чацвер пажадана не эпатаваць навакольных экстравагантнасцю паводзін. Вы справіцеся амаль з усімі важнымі справамі, нават з тымі, да якіх раней не даходзілі рукі.



**РАК.** У першай палове тыдня асаблівага напружання на працы не прадбачыцца, таму з'явіцца больш вольнага часу, які лепш выкарыстаць, адкрываючы новыя магчымасці і здольнасці ў сабе. Сярэдзіна тыдня прынясе змену настрою: станеце больш спакойнымі, сабранымі, абудзіцца цікавасць да працы. У канцы тыдня давядзецца выканаць вельмі важную справу, якая стане пачаткам у ланцужку вялікіх дасягненняў.



**ЛЕЎ.** Неабходна прадумаць план дзеянняў і не марнаваць лішнія сілы на мітусню і пустыя зносіны. Паспрабуйце пазбягаць перагрузак на працы, стан здароўя нашмат важней. Калі да вас звернуцца па дапамогу, не адмаўляйцеся, але і не ўзвальвайце на сябе груз чужых праблем. У канцы тыдня засяродзьце свае намаганні на выкананні абавязкаў у дачыненні да блізкіх людзей і сяброў.



**ДЗЕВА.** Жаданні і рэальныя дзеянні могуць прыйсці ў пэўны дысананс. Магчыма, вы вырашыце, што навакольныя вас проста выкарыстоўваюць і нічога не даюць узамен. Паверце, гэта зусім не так. Давядзецца ўціхамірыць самалюбства і падпарадкавацца распараджэнням кіраўнікоў. Паспрабуйце своечасова спыніцца, каб не справакаваць сваркі з блізкімі людзьмі. Калі вы вельмі зацікаўлены ў службовай кар'еры, то ёсць сэнс звярнуцца па дапамогу да сваіх заступнікаў менавіта на гэтым тыдні.

## Давай пажэнімся!

**У пачатку кастрычніка «Звязда» ў сваім дадатку «Чырвонка» пісала пра тое, якія незвычайныя захады рабілі маладыя людзі, каб прапанаваць сваім дзяўчынам руку і сэрца. Верталёт, кіно, білборд — гэта спрацавала на ўсе «сто». А вось як зусім нядаўна рабілі гэта замежныя патэнцыйныя жаніхі.**

### ПРАПАНОВА З

### ...кракадзілам



Утаймавальнік кракадзілаў зрабіў прапанову сваёй сяброўцы на вачах у публікі падчас шоу ў Аўстралійскім парку рэптылій, паведамляецца на старонцы парку ў Facebook. Як вынікае з відэа, маладога чалавека завуць Білі, а дзяўчыну — Шывон. Пакуль вядучы шоу расказваў гледачам, што пара сустракаецца ўжо тры гады, Білі спусціўся ў загон і пры дапамозе кавалка мяса на палцы выбавіў з вадаёма аднаго са сваіх гадаванцаў — аўстралійскага вузкарылага кракадзіла каля трох метраў даўжынёй. Пасля гэтага ён павярнуўся спіной да рэптыліі, дастаў з кішэні заручальны пярсцёнак, апусціўся на калена перад Шывон, якая стаяла каля агароджы, і спытаў, ці стане яна яго жонкай. Дзяўчына адказала згодай.

### ...мячом



Футбольны матч пятага дывізіёна Славакіі паміж клубамі «Ніжна» і «Татрана» наўрад ці зацікавіў бы каго-небудзь, акрамя адданых балельшчыкаў гэтых каманд, калі б не адзін прыгожы жэст. Адзін з гульцоў гаспадароў, Любамір Важэчка, перад стартавым свістком падышоў да бакавога арбітра Петры Лепачкавай, стаў на калена і зрабіў прапанову рукі і сэрца. Дзяўчына відавочна была не гатовая да такога развіцця падзей, але адказала згодай. За рамантычнай падзеяй назіралі каля 400 балельшчыкаў, а надзвычай натхнёная «Ніжна» выйграла хатні матч з лікам 3:1. У сваім Instagram Петра напісала, што гэта быў найлепшы дзень у яе жыцці. Таксама яна апублікавала фатаграфію Любаміра, які стаяў перад ёй на каленях.

### ...сведкамі



Капітан Эліс працуе пілотам авіякампанія Quantas вось ужо 30 гадоў і за гэты час зрабіў мноства аб'яў. Але зусім нядаўна падчас рэйса з Мельбурна ў Лос-Анджэлес ён зрабіў, бадай, самую важную аб'яву за сваю кар'еру. Пасля традыцыйнага звароту да пасажыраў судна капітан Эліс сказаў, што сярод пасажыраў ёсць вельмі важны для яго чалавек. Аказалася, што на борце ляціць яго дзяўчына Ана. Па гучнай сувязі пілот зрабіў прапанову сваёй каханай, а потым выйшаў у салон з букетам кветак. На вачах у здзіўленых пасажыраў капітан Эліс стаў на адно калена і зноў папрасіў рукі і сэрца каханай і ўручыў ёй пярсцёнак. Вядома ж Ана адказала запаветным «так!» пад апладысменты астатніх пасажыраў. Вось такое незямное каханне.

## Нядзеля, 20 лістапада

### 1 Беларусь 1

**6.50** **Меладрама «Я ведаю тваё сакрэты».**
**8.30** Народная раніца.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.45** **Серыял «Сваты-2».**
**11.05** «50 рэцэптаў першага».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** **Меладрама «Вяселля не будзе».**
**15.15** Твой горад.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** **Меладрама «Рыта».**
**18.00** Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2016».
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10** **Меладрама «Падмена ў адно імгненне».**

### 2 Беларусь 2

**7.00** «Раздаўбаі». Пазнавальна-забаўляльнае шоу. Першы выпуск.
**7.35, 20.55, 0.40** Тэлебарометр.
**7.40** Элементарыум.
**8.20** Кулінарны эксперымент.
**8.55** «Здзіві мяне 3». Талент-шоу.
**10.50, 11.55, 13.25, 15.00, 16.45, 18.20** «Самы лепшы дзень на «Двойцы». Тэлемарафон.
**11.20** Ваша лато. Пяцёрачка.
**12.15** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**13.50** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**15.20** Анімацыйны фільм «Сцюарт Літл 2».
**17.10** **Баявік «Новы Чалавек-павук».**
**20.05** Нас не падманеш.
**20.35** Два рублі.
**21.30, 22.10** **Драма «Не адпускай мяне».**
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

**23.30** **Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### 3 Беларусь 3

**7.35, 13.00** «Беларуская кухня». Качка з дранікамі.
**8.00, 13.30, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20** **«Дзень добры і бывай». Меладрама.**
**9.50** «Непрыручаная птушка». Жыццё і творчасць паэтэсы Яўгеніі Янішчыц.
**10.10** «Бард-парад».
**10.50** «Наперад у мінулае».
**11.15** «Нацыянальны хіт-парад».
**12.10** «Музеі Беларусі». Паркмузей інтэрактыўнай гісторыі «Сула».
**12.35** «Святыні Беларусі». Свята-Успенскі Жыровіцкі мужчынскі манастыр.
**13.50** «Тэатр у дэталях». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра «Вяселле ў Малінаўцы».
**14.10** «Легенды музыкі». ВІА «Пламя».
**14.30** Аўтарскі канцэрт Алега Елісеенкава.
**16.10** «Я хачу гэта ўбачыць!» Заслаўе. Маладзечна. Будслаў.
**16.35** **«Фантамас супраць Скотланд-Ярда». Камедыя.**
**18.15** **«Чатырыста ўдараў». Драма.**
**19.55** «Апошні дзень». Эльдар Разанаў.
**20.35** «Размаўляем па-беларуску».
**20.40** «Калыханка».
**21.20** **«На вайне як на вайне». Драма.**
**22.45** **«Адна ноч». Кінанавела.**

### 5 Беларусь 5

**8.00, 21.35** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — «Іслач».
**10.00** Хакей. КХЛ. «Слован» (Браціслава) — «Дынама» (Мінск).

**11.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Цэле» (Славенія).
**13.25** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Аматар» (Брэст) — «Лідсельмаш» (Ліда).
**15.00** «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
**15.25** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Парма» (Перм) — «Цмокі-Мінск».
**17.20** Гандбол. Кубак ЕГФ. 3-і кваліфікацыйны раўнд. Першы матч. «СКА-Мінск» (Беларусь) — «Сан-Рафаэль» (Францыя).
**18.55** «Два бакі алімпійскага медаля». Уладзіслаў Ганчароў.
**19.25** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. Мужчыны. УНІКС — ВЭФ.
**21.05** Фактар сілы.
**21.45** Змешаныя адзінаборствы. Чэмпіянат Беларусі па ММА.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00** (з субцітрамі), **9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с Смяшарыкі. ПІН-код.
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.45** «Фазэнда».
**11.15** Да 70-годдзя Патрыярха Кірыла. «Мы ўсе роўныя перад Богам».
**12.15** «Эвалюцыя. Дзеці».
**12.45** «Маргарыта Церахава. Адна ў залюстаркоўі».
**13.50, 16.20** «Кропля ў кроплю».
**16.15** Навіны спорту (з субцітрамі).
**17.00** «Талент краіны».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Ледніковы перыяд».
**23.30** «Беларусь без межаў» з гуртам «Без Билета».
**0.15** «Уладзімір Скулачоў. Уладар старасці».

### СТБ

**6.20** **«Няўдачнікаў.net». Серыял.**
**7.55** «Скардзіцца дазваляецца».
**8.15, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.45, 11.40, 13.45, 20.25, 1.45** «Дзень мясцічных гісторый».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**22.15** **Меладрама «Шакалад».**
**0.20** «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15** «Такія дзіўныя».
**6.40, 9.00** М/ф.
**8.00** «Культ/Турызм».
**8.30** «Беларусь сёння».
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Іншыя. Школа кахання».
**11.05** **Серыял «Пончык Люся-2».**
**14.20** «Ведаем рускую».
**15.00** «Трымайся, шоубіз!»
**15.30** «Чаму я?»
**16.15, 22.00** **Серыял «Справа гастранома №1».**
**21.00** «Разам».
**0.40** **Серыял «Неадкладная дапамога».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.35** **Маст. фільм «Вальчыны няшчасці».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.45** «Ранішняя пошта».
**13.25** «Пакой смеху».
**14.20** «Смяцца дазваляецца».
**16.30** **Маст. фільм «Бацькі і дзяды».**

**18.05** «Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя Птушка».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30** **Маст. фільм «Куды сыходзіць каханне».**
**0.05** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** **Серыял «Дарожны патруль».**
**6.50, 8.20** **Дэтэктыў «Злачынства будзе раскрыта».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** Ядзім дома.
**10.25** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.10** «НашСпажыўНагляд».
**14.15, 16.20** **Маст. фільм «Водпуск па раненні».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Акцэнты тыдня».
**19.55** **Баявік «Захоп».**
**23.40** «Навуковае асяроддзе».

### 8 канал

**9.00, 14.40, 19.00, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** **«Мультпарад». М/ф «Чыпаліна».**
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00** **Серыял «Камісар Рэкс».**
**11.45** **Трылер «Прыгоды «Пасейдона».**
**14.45** **«Глядзім усёй сям'ёй». Прыгоды «Чорны прыгажун».**
**16.10** **М/с «Даша — падарожніца».**
**16.30** **Серыял «Аднойчы ў казцы».**
**17.15** **Серыял «Чыста англійскае забойства».**
**19.05** **Трылер «Ключ ад усіх дзвярэй».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** **Драма «Атака на Перл-Харбар».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Вялікая маленькая зорка».
**7.30** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.15** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30** М/ф «Гадкае качаня і я».
**9.00** «Мой тата круцейшы!»
**10.00, 0.50** «Турбаміксер».
**12.00** «Паспецць за 24 гадзіны».
**13.00** Серыял «Два бацькі, два сыны».
**15.10** Баявік «Паліцэйскі з Бэверлі-Хілз 3».
**17.25** М/ф «Джасцін і рыцары доблесці».
**19.30** «Уральскія пельмені».
**21.20** Баявік «Рэкрут».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**3.30** «Лаві момант».
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**5.30** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Развітанне славянкі». Маст. фільм.
**11.55** «Гохран. Набыццё страчанага». Дак. фільм.
**12.35** «Расія, любоў мая!» «Карачаева-Чаркесія: сямейныя традыцыі».
**13.05** «Хто там...»
**13.35** «Дзікія астравы». Дак. серыял.
**14.30** «Аляксей Баталаў. Удзячны лёсу. Прафесія і рамяство». Дак. фільм.
**15.00** «Што рабіць?»
**15.50** Геніі і ліхадзеі. Ксенія Гемп.
**16.20** «Пешшу...» Масква калекцыйная.
**16.50** «Хлопец з Таганкі. Фільм-маналог Уладзіміра Высоцкага».
**17.50, 1.55** «Шукальнікі». «Тайна строганаўскіх мільёнаў».

**18.40** «Бібліятэка прыгод».
**18.55** «Чалавек-невідзімка». Маст. фільм.
**20.20** «Рыхтэр нязкораны». Дак. фільм.
**23.00** «Блізкі круг Віктара Рыжакова».
**23.55** «Начальнік Чукоткі». Маст. фільм.
**1.25** «Фільм, фільм, фільм». «Знаёмыя карцінкі». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1976. 2009 год.
**7.10** «Песня-76».
**8.10** «Тэма» з У. Ліcцьевым: «Дзеці знакамітасцяў». 1992 год.
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**9.40, 11.00, 13.05, 18.45, 20.45, 23.15, 0.40, 3.40, 5.00, 5.30** Музычная настальгія.
**10.00** «Колба часу».
**11.20** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1995 год.
**13.40** «Зямля—Паветра». Аляксандр Маршал. 2003 год.
**15.00** «Быў час». 2008 год.
**16.00** Фільм-спектакль «Прыйшоў мужчына да жанчыны». 1990 год.
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Аляксандр Градскі. 2007 год.
**19.10** Праграма «А». 1990 год.
**21.00** Маст. фільм «Водпуск у верасні».
**23.25** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. 2005 год.
**1.20** «Нефармалы кідаюць выклік». 1988 год.
**1.55** Канстанцін Кінчаў і гурт «Алиса» на рок-фестывалі ў Ленінградзе. 1988 год.
**4.00** «Народжаныя ў СССР».
**5.20** «Мастак і паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы». 2-я частка. 2005 год.

### EuroSport 1

**3.30, 7.00, 10.30, 15.00, 21.00** Снукер. Northern Ireland Open.
**5.00, 11.45, 14.00, 19.00** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-20).
**9.30** Watts.
**16.00, 22.00** Снукер. Northern Ireland Open. Фінал.
**1.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.

### Кінакамедыя

**0.10** Камедыя «Каханне ўразнос».
**1.40** Камедыя «Ракавая Лара».
**3.40, 15.30** Скетчкам «Паміж намі».
**4.20** Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».
**6.00** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле».
**7.40** Камедыя «Усё пуцём!»
**9.25** Камедыя «Ні хвіліны спакою».
**10.50** Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі».



**12.25** Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі 2».
**14.00** Меладрама «Снеданне ў ложак».
**16.00** Камедыя «Шэсць жонак Генры Лефэя».
**17.40** Камедыя «Superнянь».
**19.10** Камедыя «Superнянь 2».
**20.50** Меладрама «Каханне без перасадак».
**22.35** Камедыя «Хочаш ці не?»

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.50** «Паненка і кулінар».
**10.20** «Алігарх ТБ».
**10.50** «Далёка і яшчэ далей».
**11.45, 2.00** «Тайны следства». Серыял.
**15.10** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.30** «Рэвізора».
**20.30** «Без падману».
**21.25** «300 спартанцаў». Маст. фільм.
**23.35** «Асцярожна, махляры!»
**0.05** «Каліфрэнія». Серыял.
**0.35** «Звышнатуральнае». Серыял.
**5.10** «Зоркі. Тайны. Лёсы».

### ТБ1000

**6.10, 18.20** Меладрама «Двайное жыццё Чарлі Сан-Клауда».
**8.10** Прыгоды «Невераготнае падарожжа містэра Співета».
**10.10** Трылер «Каматознікі».
**12.15** Меладрама «Цяжкасці перакладу».
**14.10** Камедыя «Лак для валасоў».
**16.15** Трылер «Страчаны рай».
**20.10** Меладрама «Там, дзе сэрца».
**22.15** Меладрама «Упраўленне гневам».
**0.10** Трылер «З мяне хопіць».
**2.15** Драма «Народжаны чацвёртага ліпеня».
**4.45** Камедыя «Сцюарт Літл 2».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Шапіто-шоу: каханне і сяброўства».
**8.20** Камедыя «Тата напракат».
**10.10** Баявік «Шлях».
**12.10** Казка «Падарожжы пана Кляксы».

**15.10** Камедыя «Пятніца».
**16.50** Камедыя «У стылі jazz».
**18.30** Камедыя «Бясслаўныя прыдуркі».
**20.20** Камедыя «Шапіто-шоу: павага і супрацоўніцтва».
**22.20** Меладрама «Артыстка».
**0.20** Трылер «Вій» 3D.
**2.50** Драма «Сіндром Пятрушкі».
**4.50** Камедыя «Ржэўскі супраць Напалеона».

### National Geographic

**6.00** Чалавек супраць YouTube.
**6.40, 13.10, 5.40** Навуковыя недарэчнасці.
**7.50** Служба выратавання Аляскі.
**10.10** Незвычайныя промыслы.
**10.50** Дзікі тунец.
**11.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.20** Зборнік «Гульняў розуму».
**13.55, 4.10** Прарыў.
**15.20** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**17.10** Марс. Нова Мунда.
**18.00, 21.05, 0.15, 2.30** Марс. Прызямліліся.
**18.50, 3.20** Год у адкрытым космасе.
**19.35, 1.00** Гульні розуму.
**21.50** ЭкзаМарс. У пошуках жыцця.
**22.40** Эвакуацыя Зямлі.
**23.30** Вяртанне з мёртвых.

### Discovery

**8.00, 14.00** Зніклае золата.
**11.00, 4.40** Разбуральнікі легенд.
**12.00, 22.00** Выжыць пасля сэлфі.
**13.00, 23.00** Інвестары новага пакалення.
**15.00** Дальнабойшчыкі.
**16.00, 0.00** Залатая ліхаманка.
**17.00** Смяротны ўлоў.
**1.00** Хуткія і гучныя.
**2.00** Паляўнічыя на зброю.




## АПЕРАЦЫЯ «Ы»... І БОЛЬШ НІЯКІХ ПРЫГОД У ШУРЫКА!

Гэта гісторыя з гісторыяй: спачатку яе расказалі мне (прычым галоўны герой — мой старэйшы калега Алесь), а потым — расказваў я, ад яго імя.

Значыць, аднойчы ішоў я цераз парк культуры і адпачынку. Ішоў не сказаць, каб позна, але шарэла ўжо, ішоў няспешна, як раптам дарогу мне заступаюць аж пяць мужыкоў і кажуць, каб купіў у іх... сметніцу.

Я толькі паглядзеў на яе і — не дурны — зразумеў, што пытацца: «А навошта?» сэнсу не мае. Таму адразу цікаўлюся: «Колькі каштуе?» — «Пяць рублёў», — адказваюць мужыкі.

Пяць дык пяць, халера з імі. Гэта ж, думаю, танней, чым на твары насіць «ліхтары», устаўляць сабе зубы ці лячыць паламаныя рэбры. Дастаю з кішэні «пяцёрку», без шкадавання аддаю і, сказаўшы дзякуй, хачу пайсці далей. Але ж не! Тыя бандзюкі спыняюць. Кажуць: «Не, мужык, так не пойдзе. Грошы заплаціў, значыць, рэч твая — забірай».

Месца бязлюднае. Іх пяцёра. Дзявацца няма куды. Паспрабаваў я падняць тую сметніцу: вялікая, халера, і падобна — чыгунная, пуды на два пацягне.

Але ж неяк узваліў яе на плячо, нясу. Чую — бандзюкі тыя следам ідуць.

Такім чынам даходзім да лаўкі, да аўтобуснага прыпынку. Я ўжо добра змарыўся, сеў...

— Э, мужык, ты чаго? — пытаюць у мяне «праважатыя».

— Ды не дацягну я гэту «пакупку» — далёка жыву. Зараз, можа, трохі пад'еду.

Думаў, яны адчэпяцца. Не: двое на прыпынку засталіся, а трое разам са мной у аўтобус зайшлі, едуць.

Я зноў на хітрыкі: падняўся — і ў бок кабіны.

— Ты куды? — спыняюць «гандляры».

Кажу:

— Талончык трэба набыць. Я зайцам не езджу..

А сам грошы вадзіцелю даў, у двух словах сітуацыю патлумачыў ды шапчу: «Выратуй, браток, выпусці мяне...»

Той, дзякаваць Богу, чалавекам аказаўся: досыць рэзка затармазіў, адчыніў дзверы — я ходу... Выскачыў на вуліцу і з хуткасцю аўтобуса дамоў!

Думаеш, на гэтым мае прыгоды скончыліся? Не! Ці паверыш: назаўтра раніцай выходжу з хаты — і вочы на лоб: перад носам мая ўчарашняя сметніца стаіць, а ў ёй унутры тая «пяцёрка» — пад каменьчыкам. Містыка нейкая, ці не так?

...І сапраўды, не пазайздросціш таму, што чалавек перажыў!

Але ж добра ўсё, што добра канчаецца. А таму ў кампаніях сваіх равеснікаў я не раз расказваў гэтую гісторыю. І заўсёды, што называецца, з поспехам: усе дзівіліся, суперажывалі, усе з задавальненнем смяяліся, казалі: «Бедны мужык!», «Так і розумам крануцца можна...», «Во нехта прыкалоўся дык прыкалоўся!»

Але ж аднойчы, гадоў праз дваццаць пасля гэтага «прыколу», надарылася мне пабываць на «месцы падзей», у тым самым горадзе, трапіць у кампанію да мужчын старэйшых (відаць, аднагодкаў галоўнага героя і хуліганаў з яго гісторыі, якую я зноў жа расказаў)...

Рэакцыя была нечаканай — на тварах прысутных, што называецца, не здрыгануўся ніводзін мускул. Я аж збянтэжыўся:

— Вам што, — пытаю, — не смешна?

— Смешна.

— Значыць, вы яе чулі?

— Чаму чулі? — усміхаецца адзін з мужыкоў. — Мы падстроілі.

— ...?

— Разумееш, — уздыхнуў чалавек, — кахаў я адну дзяўчыну. Янінай звалі... Вельмі моцна кахаў. Не раз заступаўся за яе, калі хтосьці хацеў пакрыўдзіць, не раз кулакі ў ход пускаў... Але яна ўсё роўна іншага выбрала: за мяне замуж не пайшла... А гадоў праз колькі з ёй сустракаемся, пачынаем размаўляць, — чую — плача Янечка, скардзіцца, што муж ёй ні ў чым не памагае, дзяцей не глядзіць, а горш за тое — да іншых бегае, цяпер во — у парк, да чарговай каханкі... Вось мяне і «замкнула» тады. Не, вярнуць Яніну намеру не меў, бо сам ужо быў жанаты (жонка, калі памяць не падводзіць, другім дзіцем хадзіла). Проста вельмі ж кулакі засвярбелі! Вось і прапанаваў ёй зрабіць тое ж, што некалі з іншымі, — гэта значыць, «чайнік начысціць». Але Яня запярэчыла, сказала: «Не, біць чалавека — гэта дурное. Трэба неяк па-іншаму...» Вось і прыдумалі мы з ёй аперацыю са сметніцай. А правесці яе мне сябры дапамаглі. Я ім за гэта скрыню «казёнкі» паставіў... Галоўнае — не дарэмна: забыўся Янін муж дарогу ў парк. Ды што там — нават у той раён.

**А. Ліпень,**
*Іўеўскі раён.*

## «СЯБРОЎСКІ» ПАЧАСТУНАК

...У той дзень па дарозе дамоў я купіла груш. Ды такіх прыгожых!.. Водар — на ўсю хату!

І, мусіць жа, праўду кажуць, што на смачны кусок знойдзецца раток: суседка якраз заходзіць. Я давай частаваць, а яна ў адказ:

— Я груш не ем, наогул... З маладых гадоў.

— Гэта ж чаму? Паглядзі, якія спелыя, смачныя...

— Ага, — згаджаецца, — у мяне акурат з-за такіх ці не ўсё жыццё наперакос пайшло.

І далей, цяжанька ўздыхнуўшы, пачала ўзгадваць:

Я тады маладзенькай была і вельмі сарамлівай... Але ж неяк на танцах у заводскім Палацы культуры пазнаёмілася з хлопцам, з Мікалаем. Ён мне вельмі спадабаўся, прычым з першага погляду! І я, відаць, яму даспадобы прыйшлася, бо часцяком мяне ў круг выводзіў — у першы вечар і ў наступныя. Мы спачатку хіба на танцах сустракаліся. Толькі з часам ён мне спатканне прызначыў — першае ў маім жыцці! Маладая была, дурная — адной ісці страшнавата. Вось я і ўзяла з сабою сяброўку.

Сустрэліся, утраіх пагулялі па парку, схадзілі ў кіно. Людачка, тая сяброўка мая, увесь час нечага смяялася, весела шчабятала, гарэзліва пазірала на Міколу.

Але ж дамоў усё роўна ён праводзіў мяне.

Мы з ім потым пастаялі яшчэ — дамовіліся сустрэцца ў суботу на танцах.

А назаўтра з раніцы да мяне Людміла прыбягае. Фыркае:

— І што ты ў гэтым хлопцы знайшла? Ну нічога ж асаблівага!

Я маўчу, бо ёй, можа, і сапраўды нічога... Але ж пры гэтым яна пытаецца, як мы рассталіся, ці дамовіліся сустрэцца зноў?

Мне б, дурніцы, прамаўчаць, патрымаць язык за зубамі, а я ўсё і выклала — пра танцы, пра суботу...

А ў пятніцу вечарам Людачка прыйшла зноў, прычым з ладнай сумкай ігруш. Сказала:

— Гэта табе, частуйся. Смачныя — не перадаць! Ты такіх, відаць, зроду не ела!

І сапраўды, грушы былі на дзіва прыгожыя — жоўтыя, духмяныя...

З'ела я адну, другую...

— Еш болей, — настойвала Людачка. — Яны ж, бачыш, якія спелыя. Доўга не паляжаць — сапсуюцца і выкінеш.

Выкідваць такую смакату я, вядома ж, не магла. А таму ўсю суботу — нешта мыючы, гатуючы, прыбіраючы ў кватэры — я частавалася ігрушамі.

Скончылася гэта тым, што пад вечар мне так разбалеўся жывот, — свет нямілы.

Вядома ж, не да танцаў было... І не да спатканняў.

На хвілінку забегла Людачка — у новай сукенцы, з прыгожай прычоскай, уся размаляваная... Пашкадавала мяне, павойкала і некуды збегла.

У нядзелю мае пакуты не скончыліся. Таму я зноў прасядзела дома. Потым пачалася сесія ва ўніверсітэце... А потым я даведалася, што Мікола сустракаецца з Людачкай. Горш за тое, яна прызналася нашай агульнай сяброўцы Валі, што Мікола ёй вельмі спадабаўся, таму грушамі яна пачаставала мяне знарок.

— З таго часу я груш не ем, — сумна ўсміхнулася Алена. — Я нават глядзець на іх не магу...

**Галіна Гузянкова,**
*г. Гомель.*

## ЦУД ПРЫРОДЫ

...«Жывуць як галубкі!» — кажуць пра тых, хто жыве ў любові і згодзе.

«Жывуць як кот з сабакам»?

Тут ужо ёсць пытанне.

Мае малыя некалі прынеслі дамоў маленькае кацяня. Яно-то ў хаце было непатрэбнае, але ж паспрабуй скажы ім, каб занеслі назад, — слёз не абярэшся...

Такім чынам у нас з'явілася рэдкая чысцёха — прыгожая сібірская кошка. А далей — болей, як той казаў: не прайшло і паўгода — новая навіна: з'яўляецца сабачка, прычым зусім маленечкі... Зноў жа дзеці прынеслі.

Тое, што падабралі на вуліцы, тое, што пашкадавалі, нас з маці ніколькі не здзівіла. А вось паводзіны раней падабранай кошкі...

Яна адразу ж падышла да малога, абнюхала яго і... прыняла, як свайго: стала вылізваць, стала саграваць. Цікава назіраць было!

Але ж не паспелі, можна сказаць, самі надзівіцца, заходзіць знаёмы. З парога пытаецца, як пажываем, што ў нас новага. Кажу яму:

— Зараз пакажу.

І выношу з пакоя каробку.

Чалавек вокам кінуў і нічога не зразумеў:

— Што, — пытаецца, — толькі адно кацяня?

А ўжо потым вочы «разуў» і ім жа не паверыў:

— Дык гэта ж не кацяня? Гэта ж сабачка?! Я так разумею?

— Так.

— І што — яго кошка прывяла?

Заўважце, гэта не я сказаў. Я проста пацвердзіў:

— Кошка... Толькі я цябе папрашу: ты пра гэта нікому не кажы, добра? А то яшчэ шуміха падымецца, чаго добрага тэлебачанне ў вёску прыедзе... А навошта яно? То не скажаш?

— Не.

Такім чынам, слова гэты чалавек мне даў, але ж потым не вытрымаў: што называецца, назад забраў, бо праз нейкі час тэлефануе мне адна з нашых кабет і кажа:

— Гэта ж няпраўда, што твая кошка ды сабачку прывяла?

Адступаць няма куды: хлусам выглядаць не хочацца:

— Праўда, — кажу. — А калі не верыш, дык прыходзь ды паглядзі. Я сёння дома буду...

Жанчына нейкі час, мусіць, думала, ісці ці не ісці, нейкі час вагалася, бо прыйшла не адразу. Але ж прыйшла! Я зноў выцягнуў каробку са сваёй «салодкай парачкай». Кабета глядзіць на яе і ледзьве не хрысціцца:

— Божухна, як жа гэта?! Ну не можа ж такога быць? Я вачам не веру!.. Шчаня?.. Ці, можа, гэта кацяня такое?

І (ведама баба!) руку працягвае — не тое, каб паглядзець, не тое, каб пагладзіць.

А кошка ж не дурная ў нас, разумее ўжо, што гэта чужы чалавек, і як ашчэрыцца, як зашыпіць... І лапай па той руцэ: не лезь, маўляў, не чапай малое...

У цёткі — вочы з арбіт, бо атрымліваецца, што кошка бароніць дзіця... Як сапраўдная маці! Значыць, так яно і ёсць?..

Але ж паверыць у гэта па-ранейшаму цяжка. Сядзіць жанчына, у каробку глядзіць, у мяне пытаецца:

— Як жа так атрымалася, га?

— А што тут дзіўнага, — ёй кажу. — Кошка хоць і пушыстая, але ж малая, слабая. А сабака — дужэйшы, большы. Вось, відаць, і заціснуў недзе — сілай узяў... Такое ж бывае?

— Бывае, — прызнала кабета.

Нейкі час яна яшчэ пасядзела ў нас, падзівілася на гэты «цуд прыроды». І, паабяцаўшы, што нікому нічога не скажа, пайшла.

...Як ні дзіўна, слова сваё жанчына стрымала: паглядзець на цуд не прыходзіў болей ніхто.

І тэлебачанне з гэтай нагоды да нас не прыязджала.

**М.І.,**
*Кіраўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў

# Немахляры і неахвяры



## Што ўбачылася з «аварыйнага» акна

З НЯДАЎНЯГА часу я перастала зайздросціць пенсіянерам, хатнім гаспадыням і адпускнікам — карацей, тым, хто мае магчымасць заставацца ў цёплай утульнай кватэры ў той час, як іншыя па холадзе, у набітым транспарце дабіраюцца на працу. На паверку задавальненне правесці некалькі будных дзён дома аказалася вельмі нават сумніўным.

Пра заўсёдны і ўсюдыісны дрыль я нават не згадваю: у высотным аднапад'ездным доме, дзе больш за сто кватэр, ён спявае штодня, калі цішэй, калі гучней — у залежнасці ад таго, на якім паверсе робяць рамонт. (Мне якраз «пашанцавала»: суседзі акурат над галавой перакладвалі на свой лад электрычную праводку ў сценах, таму некалькі дзён мы жылі пад акампанемент «балгаркі».) І гэта яшчэ не ўсё: пасля адзінаццаці прачынаюцца «тэлефонныя тэрарысты», якія адзін за адным пачынаюць назвоньваць на хатні нумар. Пачуць за некалькі дзён давялося шмат цікавага. Чаго толькі вартыя запрашэнні на прэзентацыі «эксклюзіўнага швейцарскага посуду», «элітнай французскай бялізны», «цудадзейнага медыцынскага абсталявання», іншай ну вельмі патрэбнай у гаспадарцы халеры і трасцы. (Пра тое, што падобныя «выгадныя прапановы» заканчваюцца элементарным выцягваннем грошай, я нядаўна пісала.) Маючы ўжо выпрацаваны імунітэт, на такія званкі спакойна адказвала: дзякуй, маўляў, але гэта нас не цікавіць.

АЛЕ адно тэлефанаванне ўсё-ткі заспела знянацку. «Добры дзень. Гэта вуліца...?» — прыемны і строгі жаночы голас упэўнена назваў мой адрас. «Так». «Ваша вуліца трапіла пад праграму праверкі шклопакетаў. Мы працуем па даручэнні Адміністрацыі вашага раёна. Мы не дзяржаўнае прадпрыемства, але правядзенне гэтых работ даручылі менавіта нам. У вас ёсць шклопакеты, якім больш за два гады?» Атрымаўшы станоўчы адказ, кабета на другім канцы провада бойка шпарыла далей, не даючы апомніцца і ўставіць хоць слова. З яе актыўнага маналогу вынікала, што падобная праверка — справа ледзь не дзяржаўнай важнасці, што я проста павінна дапусціць у кватэру іхняга спецыяліста, а інакш на маю галаву пасыплюцца непрыемнасці з боку камунальных службаў нашага раёна... Улічваючы асаблівую ўвагу да гарадскіх вокнаў пасля летніх трагедый з дзецьмі... Вы б вытрымалі такі націск, ды яшчэ са згадкай канкрэтнага адраса і спасылкай на мясцовую ўладу? Вось і я пра тое ж...

